ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЛІПЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 129 (28239)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Насця Жабко: «Без музыкі ўжо нікуды»



## «Патрыятызм — не захапленне знешнімі рэчамі»




## Запрашаюць Аўцюкі

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**227**

*ініцыятыўных груп па зборы подпісаў грамадзян для вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання зарэгістравалі акруговыя выбарчыя камісіі па ўсёй Беларусі. Паводле звестак на ўчарашні вечар, у ЦВК было пададзена 330 заяў на рэгістрацыю такіх груп. Пры гэтым адна з іх адклікана, яшчэ ў чатырох выпадках атрыманы адмовы. Астатнія заявы пакуль апрацоўваюцца. Камісіі працягваюць іх прымаць, але тэрміны ўжо завяршаюцца. Дакументы неабходна здаць не пазней за 7 ліпеня. Рэгістрацыя кандыдатаў пройдзе з 2 па 11 жніўня ўключна. Агітацыйя кандыдаты змогуць займацца з дня сваёй рэгістрацыі па 10 верасня. У дзень галасавання — 11 верасня — агітаваць ужо нельга.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0159 | ▲ |
| Еўра | 2,2299 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0311 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0812 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Першыя крокі па роднай зямлі




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гомельшчына. Г.п. Акцябрскі. Лета 2016.

Паўднёвы Усход
Сумесны праект газеты «Звязда» і Магілёўскага аблвыканкама

## ЧЫРВОНАЕ ПОЛЕ

**Летась у Магілёўскай вобласці была зацверджана праграма, якая павінна даць дадатковы імпульс развіццю эканомікі 7 раёнаў вобласці — Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Краснапольскага, Крычаўскага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага і Хоцімскага. Указам №235 для гэтага прадугледжаны сур'ёзныя льготы і прэферэнцыі, вельмі прывабныя для бізнесу і цікавыя для насельніцтва. Праграма мае на мэце спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў, будаўніцтву жылля, адным словам — росквіту. У рамках праекта «Паўднёвы ўсход» «Звязда» працягвае расказваць, як выкарыстоўваюцца перавагі Указа, наколькі яны цікавыя прадпрымальным людзям. Першыя нашы выпускі былі прысвечаны Чэрыкаўскаму і Слаўгарадскаму раёнам. Цяпер адпраўляемся ў Краснапольскі.**

### Край будучых садоў

Апошнія некалькі гадоў у Краснапольскім раёне актыўна займаюцца аднаўленнем садоў. Па ініцыятыве мясцовых дэпутатаў і з дапамогай Міжнароднага фонду развіцця сельскіх тэрыторый быў рэалізаваны праект «Зялёная эканоміка саду для адраджэння вёскі («Дрэвы супраць беднасці і дэградацыі зямлі»)». На яго аснове распрацавана мясцовая праграма «Зялёная эканоміка ў Краснапольскім раёне на 2014—2018 гады».

— Вельмі ўдзячны нашаму дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Таццяне Кананчук, якая падказала нам гэту ідэю, — кажа **старшыня Краснапольскага райвыканкама Ігар БАЛАХОНАЎ**. — З удзелам аддзела адукацыі, спорту і турызму, а таксама насельніцтва прывялі ў належны выгляд сады ў Стайках, Пачапах, Клясіне. На тэрыторыі Пачапоўскага комплексу «Дзіцячы сад-школа» закладзены нават гадавальнік. Цяпер з дапамогай вырашчаных у ім саджанцаў аднаўляюцца сады мясцовых жыхароў. Так што ёсць усе шанцы, што ў будучым Краснапольскі раён стане краем садоў.

СТАР. 4

■ Фестывалім

## У Александрыю — па папараць-кветку

**Да галоўнай купальскай падзеі засталося зусім трохі. Фестываль «Александрыя збірае сяброў» адбудзецца ўжо ў гэтыя выхадныя — 9 і 10 ліпеня. Традыцыйнае народнае свята на маляўнічай пляцоўцы на беразе Дняпра ў Шклоўскім раёне абяцае стаць самым маштабным за ўсю гісторыю свайго існавання, бо праходзіць сёлета пад знакам Года культуры. Чакаецца, што яго наведае каля 100 тысяч гасцей з Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краін блізкага і далёкага замежжа.**

«Александрыя збірае сяброў» Свята «Купалле-2016»

Праграма настолькі насычана рознымі культурнымі падзеямі, што арганізатары настойліва раяць першай справай здзейсніць «Александрыйскую вандроўку». Падчас яе можна будзе наведаць «Прадмесце прысмакаў» з дэгустацыяй страў беларускай, рускай і ўкраінскай кухняў, прайсціся па гандлёвых радах «Александрыйскай гасціны», завітаць на «Друкарскі двор» часоў Сярэднявечча, пакаштаваць купальскіх прысмакаў з «Яселькі з ласункамі», падзівіцца на цуды хлебнага мастацтва на «Каравайнай сялібе», акунуцца з галавой у «раку сяброўства» з яе безлічным выбарам вырабаў ад лепшых айчынных і замежных майстроў.

Дзяцей і дарослых чакае шмат гульнявых атракцыёнаў, выстаўка жывёл і рыб, паказальныя выступленні спартсменаў па конным спорце, паветранае авіяшоу з удзелам парашутыстаў. Будзе магчымасць наведаць пляцоўкі любімых народам свят — Вялікай бард-рыбалкі і «Уладара сяла». А тых, хто цікавіцца гісторыяй, чакае экспазіцыя «Археалагічныя знаходкі Верхняга Падняпроўя» ў Александрыйскай сярэдняй школе. Заадно будзе магчымасць азнаёміцца з экспанатамі, прысвечанымі дзейнасці кіраўніка дзяржавы.

СТАР. 3

# Дзеля паўнавартаснай знешняй палітыкі

### Наша краіна жадае нармалізацыі адносін з ЗША на ўзаемавыгадных умовах

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з часовым паверáным у справах ЗША ў Беларусі Скотам Роландам.**

Прэзідэнт канстатаваў, што ў Беларусі ёсць пэўныя абавязацельствы перад краінамі-суседзямі, у тым ліку цеснае супрацоўніцтва з Расіяй, а таксама такімі дзяржавамі, як Кітай, Індыя. «Гэта нашы стратэгічныя саюзнікі, партнёры. Мы з імі заключылі адпаведныя дагаворы», — сказаў ён.

«Але мы ніколі не ўтойвалі той факт, што без нармалізацыі адносін са Злучанымі Штатамі мы не будзем мець паўнавартаснай знешняй палітыкі. Мы не ўтойваем, што вельмі хацелі б нармалізацыі стасункаў з ЗША на ўзаемавыгадных умовах», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў паляпшэнне адносін паміж Беларуссю і ЗША, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «Пры добрай волі кіраўніцтва Злучаных Штатаў мы вельмі многае можам зрабіць у найбліжэйшай будучыні», — падкрэсліў ён.

«У нас няма забароненых тэм у супрацоўніцтве з вамі. Мы не маем ні перад адной дзяржавай абавязацельстваў, якія б супярэчылі нашаму супрацоўніцтву з ЗША», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Яшчэ раз падкрэсліваю: калі на гэта будзе добрая воля Злучаных Штатаў, мы вырашым любыя праблемы. Аснова павінна быць адна — шчырасць, прыстойнасць і давер», — дадаў беларускі лідар.

«Мы вельмі рады прагрэсу, якога дасягнулі тут за апошнія два гады. Хочам падзякаваць вам і Міністэрству замежных спраў, якое супрацоўнічала з намі па многіх пытаннях. Мы спадзяёмся, што гэта дасць станоўчы імпульс для поўнай нармалізацыі адносін у будучыні», — заявіў у сваю чаргу Скот Роланд.

«Вашынгтон хацеў, каб я вам перадаў: мы гатовыя і далей супрацоўнічаць з Беларуссю, каб была добрая будучыня. Галоўнае, каб тэрытарыяльны суверэнітэт і незалежнасць Беларусі былі на самым высокім і дужым узроўні», — сказаў дыпламат.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў: «Незалежнасць і суверэнітэт для мяне як Прэзідэнта і для беларускага народа — гэта святое».

# Працэдура падаткаабкладання павінна быць камфортнай,

### але пры гэтым мусіць гарантаваць рэалізацыю законных інтарэсаў дзяржавы

**Гэтае пытанне абмяркоўвалася падчас рабочай сустрэчы Прэзідэнта з міністрам па падатках і зборах Сяргеем Налівайкам.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што падатковыя органы перажываюць свайго роду пераломны этап у пытаннях удасканалення сістэмы падаткаабкладання і адміністравання. «Што зроблена, асабліва калі браць пад увагу інфарматызацыю? Мы дамаўляліся аб тым, што ў гэтым плане будзе зроблена нямала ў вашым ведамстве», — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка.

Асноўнай тэмай даклада кіраўніку дзяржавы была эфектыўнасць укаранёных электронных сістэм кантролю, а таксама рэалізацыя з 1 ліпеня механізму электронных рахункаў-фактур для плацельшчыкаў ПДВ, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Было далажана аб эфектыўнасці адпаведных сістэм, павышэнні збіральнасці плацяжоў, зніжэнні колькасці праверак. «Гэты трэнд будзе працягнуты. Наша асноўная задача — забяспечыць добрасумленным суб'ектам гаспадарання бескантактнае ўзаемадзеянне з падатковай службай пры мінімуме праверак. Калі аналітычныя сістэмы не паказваюць ніякіх рызык, праверак можа не быць у прынцыпе», — сказаў Сяргей Налівайка па выніках даклада.

Адным з важных напрамкаў таксама з'яўляецца забеспячэнне стабільнасці ў падатковай сферы з пункту гледжання нязменнасці падаткаў і падатковых ставак. Праца па гэтым пытанні будзе працягнута з улікам эканамічнай сітуацыі, адзначыў міністр.

■ Выбары–2016

# ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ГРУПЫ ПАЧЫНАЮЦЬ АГІТАВАЦЬ

**У Мінску зацверджана 20 выбарчых акруг. Адпаведна створаны 20 акруговых і адна гарадская выбарчая камісія. У іх склад уключана 260 чалавек.**

Па словах **сакратара Мінскай гарадской выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання Арцёма ЦУРАНА**, на вечар 5 ліпеня ў выбаркамы горада паступіла 91 заява на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Дзвюм ініцыятыўным групам адмовілі, і абскарджвання ад іх яшчэ не паступала. Астатнія рэгіструюцца ў вызначаным парадку. Сярод асоб, якіх прадстаўляюць гэтыя групы, прыблізна 30% — прадстаўнікі розных партый.

***

**У Магілёўскай вобласці** сфарміраваны абласная і 13 акруговых выбарчых камісій па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання. У рабоце камісій задзейнічаны 182 чалавекі, у тым ліку дзяржслужачых крыху больш за 20%, прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў больш за 60%, моладзі да 30 гадоў каля 4%. Большая частка прадстаўлена жанчынамі.

Да 7 ліпеня імі прымаюцца дакументы для рэгістрацыі ініцыятыўных груп у падтрымку тых ці іншых кандыдатаў. На 5 ліпеня было пададзена 26 пакетаў дакументаў для рэгістрацыі ініцыятыўных груп. 13 груп зарэгістравана, дакументы астатніх разглядаюцца. Як патлумачылі ў абласной выбарчай камісіі, у рэгістрацыі можа быць адмоўлена пры парушэнні патрабаванняў Выбарчага кодэкса. Гэта калі асоба на месца кандыдата ў дэпутаты не адпавядае патрабаванням кодэкса або колькасць ініцыятыўнай групы меншая за 10 чалавек. Адначасова ў вобласці вядзецца акрэдытацыя назіральнікаў. На 5 ліпеня абласной і акруговымі камісіямі было акрэдытавана 7 назіральнікаў.

Усяго ад Магілёўскай вобласці на выбарах у Палату прадстаўнікоў павінна быць выбрана 13 дэпутатаў.

***

Паводле інфармацыі на ўчарашнюю раніцу, **на Гродзеншчыне** пададзена 26 заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп і 18 з іх ужо былі зарэгістраваны. Сярод магчымых кандыдатаў у дэпутаты, якіх прадстаўляюць гэтыя групы, 14 чалавек — беспартыйныя, 4 — члены розных партый.

Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў **сакратар Гродзенскай абласной выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Павел МІХАЛЮК**. Па яго словах, у абласную камісію былі звароты ўдакладняльнага характару па тых ці іншых аспектах выбарчай кампаніі, а сігналаў аб нейкіх праблемных выпадках не паступала.

У Гродзенскай вобласці створана 13 акруговых выбарчых камісій. У іх складзе 169 чалавек, якія вылучаліся прафсаюзнымі арганізацыямі, грамадскімі аб'яднаннямі, палітычнымі партыямі і шляхам падачы заяў грамадзян. У складзе камісій 10 членаў Камуністычнай партыі Беларусі, 3 — Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, 2 — Беларускай партыі левых «Справядлівы мір», па адным — партыі БНФ і Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). Сярод грамадскіх аб'яднанняў найбольш шырока ў акруговых выбарчых камісіях прадстаўлены члены «Белай Русі», Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, Беларускага саюза жанчын, ГА «Беларускі фонд міру», Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

***

**На Гомельшчыне** утворана 18 выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

ЦВК зацвердзіла ўтварэнне 17 выбарчых акруг. Адпаведна сфарміравана 17 акруговых і адна абласная тэрытарыяльная выбарчая камісія. Усяго ў Гомельскую абласную і акруговыя выбарчыя камісіі было пададзена 329 заявак. У выніку ўсе выбарчыя камісіі сфарміраваны ў максімальна магчымым складзе — у колькасці 13 чалавек. Пераважная большасць іх удзельнікаў прадстаўляюць грамадскія арганізацыі і палітычныя партыі.

Па звестках на 4 ліпеня, адзначыў **старшыня Гомельскай абласной выбарчай камісіі Мікалай СТОШ**, у выбарчыя камісіі вобласці паступіла 27 заяў пра рэгістрацыю ініцыятыўных груп па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання. За два дні да канца ўсталяванага законам тэрміну на пасяджэннях акруговых выбарчых камісій зарэгістравана 16 ініцыятыўных груп.

***

Вопыт у арганізацыі выбараў, які напрацавалі ў Віцебску і Полацку, варты пераймання, заявіў учора **Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў** у сваім выступленні перад прадстаўнікамі мясцовай улады абласнога і раённага ўзроўняў **Віцебскага рэгіёна**, адказных за правядзенне выбарчай кампаніі ў парламент.

У прывітанасці, падчас мінулых выбарчых кампаній збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у згаданых вышэй гарадах дазвалялі арганізоўваць паўсюль, але канкрэтна былі вызначаны месцы, каля якіх устаноў гэта забаронена. Мікалай Лазавік падкрэсліў, што чым менш непатрэбных забарон, тым больш свабодна і дэмакратычна праходзіць выбарчы працэс.

На цяперашняй падрыхтоўцы да выбараў на Віцебшчыне таксама ёсць станоўчы вопыт.

— Упершыню праводзіліся персанальнае абмеркаванне кожнай кандыдатуры ў склад абласной тэрытарыяльнай і акруговых камісій і рэйтынгавае галасаванне. Рэкамендуецца, каб органы мясцовай улады на пасяджэннях па фарміраванні выбарчых камісій праводзілі дыскусіі і абмеркаванні дзеляваых якасцяў кандыдатаў у члены камісій. Гэта значыць, што ўсім прадстаўнікам партый трэба даць слова, — сказаў сакратар Цэнтрвыбаркама.

Ён падкрэсліў, што цяперашняя выбарчая кампанія нацэльваецца на максімальны дэмакратызм і адкрытасць усіх выбарчых працэсаў.

На Віцебшчыне сфарміравалі 14 акруговых і абласную тэрытарыяльную выбарчую камісіі. У іх складзе каля 200 чалавек. Гэта члены грамадскіх аб'яднанняў, партый, прадстаўнікі працоўных калектываў і грамадзяне.

***

**На Брэстчыне** зацвердзілі 16 выбарчых акруг і адпаведна 16 акруговых і адну абласную тэрытарыяльную выбарчую камісію. Усе выбарчыя камісіі сфарміраваны ў максімальна магчымым складзе з колькасцю 13 чалавек. Большасць — прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў.

Па словах **члена Брэсцкай абласной выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вольгі ДЗЯМКО**, на 6 ліпеня паступіла 45 заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты. На вечар 6 ліпеня на пасяджэннях акруговых выбарчых камісій зарэгістравана 26 ініцыятыўных груп. Сярод прэтэндэнтаў на кандыдатаў у дэпутаты, якіх прадстаўляюць гэтыя групы, 10 чалавек — беспартыйныя, 16 — прадстаўнікі розных партый.

Нагадаем, што вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты пачалося 3 ліпеня і будзе доўжыцца да 1 жніўня (уключна).

**Ілья КРЫЖЭВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Барыс ПРАКОПЧЫК, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Кітайскі вектар

# СУПЕРМАРАФОН НАШЫХ МАЗаў У ПЕКІН

**Каманда «МАЗ-СПОРТаўта» гэтымі днямі адпраўлілася ў трансконтынентальнае ралі «Шаўковы шлях — 2016», якое ўпершыню пройдзе па напрамку з Масквы ў Пекін. Да марафону падрыхтаваны і пратэсціраваны два новыя аўтамабілі з сучаснымі рухавікамі, паведамілі ў камандзе.**


Фота БЕЛТА.

Беларускіх гоншчыкаў чакае больш за 10 тысяч кіламетраў складанага і выматвальнага бездарожжа, прычым больш за палову ўсяго шляху складуць хуткасныя ўчасткі. Экіпажам трэба будзе пераадолець бязмежныя стэпы, стромкія горныя серпанціны, каварныя пяскі і дзюны. Маршрут будзе праходзіць па тэрыторыях трох краін — Расіі, Казахстана і Кітая. Арганізатары падрыхтаваліся ўдзельнікам сапраўдную праверку на трываласць, бо «Шаўковы шлях» можа стаць адным з самых складаных ралі ў свеце.

Беларусь на ралі прадстаўляць тры грузавікі. Два новыя грузавікі МАЗ атрымалі 12,5-літровыя рухавікі, створаныя чэшскай камандай Buggyra на аснове агрэгатаў ад Caterpillar. Тэставыя выпрабаванні грузавікоў нядаўна з поспехам прайшлі на палігоне пад Мінскам. Пры ўдалым выступленні на «Шаўковым шляху» каманда, верагодна, выступіць на іх і на «Дакары».

Новы аўтамабіль атрымаў экіпаж Сяргея Вязовіча (пілот), Паўла Гараніна (штурман) і Андрэя Жыгуліна (механік). Сучасны спорткар павядуць таксама Аляксандр Васілеўскі (пілот), Дзмітрый Віхранка (штурман) і Антон Запарошчанка (механік). Трэці экіпаж будзе ўдзельнічаць на баявой машыне, на якой раней выступаў Сяргей Вязовіч. За яе рулём будзе Аляксей Вішнеўскі, вядомы як трохразовы чэмпіён Беларусі па дрыфтынгу. Кампанію яму складуць штурман Максім Новікаў, а ў якасці механіка будзе Канстанцін Сінябок, які ў выпадку неабходнасці выступіць і пілотам.

Беларусы на «Шаўковым шляху» будуць змагацца за першыя месцы. «Мы ўжо сфарміраваліся як каманда, у свеце аўтаспорту нас ведаюць і паважаюць. Цяпер наша задача — не проста развівацца, але і паказваць высокія вынікі. Апошнія трэніроўкі паказалі, што машыны і гоншчыкі гатовыя да любых выпрабаванняў. Усе разумеюць: гонкі такога ўзроўню — гэта не проста спорт, але і шанц паказаць магчымасці беларускай тэхнікі і павысіць імідж краіны за мяжой», — падкрэсліў ў камандзе «МАЗ-СПОРТаўта».

Міжнароднае ралі «Шаўковы шлях» стартуе 8 ліпеня з Краснай плошчы ў Маскве і завершыцца 24 ліпеня на плошчы Цяньаньмэнь у Пекіне. Гоншчыкаў чакае 15 этапаў — на два больш, чым на «Дакары». Маршрут марафону будзе праходзіць праз 15 гарадоў, пустыню Гобі і хрыбты Цянь-Шаня, а адзін з этапаў прывядзе да возера Балхаш. У ралі-рэйдзе прымуць удзел 24 грузавікі і 100 пазадарожнікаў. Арганізатарам каманды «МАЗ-СПОРТаўта» выступае Мінскі аўтазавод. Гоншчыкі пяць гадоў запар удзельнічаюць у «Дакары» і іншых буйных ралі-рэйдах. Беларускія экіпажы часта ўваходзілі ў лік найлепшых экіпажаў на асобных этапах, а таксама ў генеральнай класіфікацыі па выніках гонак.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Абітурыент–2016

# НА ЎСЕ СТО!

## Колькасць максімальных вынікаў па беларускай мове павялічылася ўтрая

**86 стабальных сертыфікатаў будзе выдадзена сёлета ўдзельнікам цэнтралізаванага тэсціравання па рускай мове (летась іх было 83) і 50 стабальных сертыфікатаў — абітурыентам, якія здавалі на ЦТ беларускую мову (у 2015 годзе — 18).**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пераадолелі мінімальнае парогавае значэнне тэставага бала па рускай мове, устаноўленае Міністэрствам адукацыі (10 балаў), 94% удзельнікаў тэсціравання, а па беларускай мове — 93%.

Абсалютны вынік (100 балаў) на ЦТ па замежных мовах атрымалі 33 чалавекі. Усе яны скончылі ўстановы адукацыі розных тыпаў і з'яўляюцца прадстаўнікамі ўсіх рэгіёнаў (11 стабальнікаў з Мінска, 3 — з Мінскай вобласці, 2 — з Брэсцкай, 3 — з Віцебскай, 7 — з Гомельскай, 1 — з Гродзенскай і 6 — з Магілёўскай).

Сярэдні бал экзаменаваных аказаўся вышэйшым, чым летась.

— Як і ў папярэднія гады,назіраецца залежнасць атрыманых вынікаў ад тыпу ўстановы адукацыі і ўзроўню вывучэння прадмета (базавы, павышаны, паглыблены), — пракаментаваў вынікі ЦТ **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Сярэдні бал выпускнікоў гімназій па англійскай мове склаў 60,14, нямецкай — 63,54, французскай — 55,46, іспанскай — 61,09. У выпускнікоў ліцэяў: па англійскай мове — 57,01, нямецкай — 57,36, французскай — 54,27, іспанскай — 50,2, кітайскай — 57. У выпускнікоў школ: па англійскай мове — 39,37, нямецкай — 43,76, французскай — 36,45, іспанскай — 44,09.

На ЦТ па сусветнай гісторыі найноўшага часу самы высокі вынік (96 балаў) атрымаў адзін абітурыент. Не атрымаў ніводнага бала таксама адзін удзельнік экзамену (у ранейшыя гады нулявых вынікаў не было). Аналіз яго бланка паказаў, што абітурыент нават не прыступіў да выканання заданняў у частцы В, а ў частцы А на ўсіх заданнях замест аднаго правільнага адказу адзначыў два і больш варыянты.

Не пераадолелі парогавага значэння тэставага бала, вызначанага Міністэрствам адукацыі для першага профільнага прадмета (20 балаў), 13,5% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ па сусветнай гісторыі, для другога профільнага прадмета (15 балаў) — 2,6% .

Каментуючы вынікі ЦТ па геаграфіі, Міхаіл Журураўкоў адзначыў, што ў цэлым яны аказаліся вышэйшымі за леташнія.

Максімальны вынік, атрыманы на ЦТ у 2016 годзе — 95 балаў, а мінімальны — 4 балы.

Пераадолелі парогавае значэнне тэставага бала па геаграфіі, вызначанае для першага профільнага прадмета (20 балаў), 82% абітурыентаў (у 2015 годзе — 76,3%), для другога профільнага прадмета (15 балаў) — 96% абітурыентаў (у 2015 г. — 92%).

— Па выніках выканання экзаменацыйнай работы ў тэстах адсутнічаюць заданні, з якімі б не справіўся ніводзін абітурыент. Гэта сведчыць пра тое, што ўсе заданні былі выканальныя, — падкрэсліў міністр.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

# У Александрыю — па папараць-кветку

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Асобную праграму прапануюць малая і вялікая канцэртныя пляцоўкі. Там нарэшце раскрыецца інтрыга арганізаванага галоўным упраўленнем ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама конкурсу на найлепшы купальскі касцюм «Купаліш, Купалінка». Пераможцаў чакаюць сур'ёзныя прызы. А вечарам, а палове дзесятай, госці акунуцца ў феерычную музычную купальскую казку з чароўнымі прыгодамі рамантычных герояў. Білеты на яе былі раскуплены яшчэ задоўга да свята. На прадстаўленне запрошаны Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка. Купальская феерыя скончыцца грандыёзным феерверкам і лазерным шоу. І амаль да раніцы папулярныя артысты і вядучыя дыджэі будуць весяліць народ на начной дыскатэцы.

І гэта толькі галоўныя падзеі купальскага свята. Іх нашмат больш у фестывальнай праграме. Праца тэматычных пляцовак пачнецца ў суботу з 14.00, а закончыцца ў нядзелю ў 18.00. Каб у кожнага была магчымасць далучыцца да народных гулянняў, з Магілёва і Оршы ўводзяцца дадатковыя дызельгігнікі і аўтобусы. Яны будуць курсіраваць у тым ліку і ноччу. З раскладам руху можна падрабязна азнаёміцца на сайце Магілёўскага аблвыканкама. Там жа можна знайсці схему парковак асабістага транспарту. На тэрыторыі купальскага фэсту будуць працаваць камеры захоўвання. Пакіньце дома буйнагабарытную фота- і відэатэхніку. Інакш могуць узнікнуць праблемы з праходам на святочную тэрыторыю. У мэтах бяспекі грамадзян будзе працаваць 12 кантрольна-прапускных пунктаў. Здароўе адпачывальнікаў будзе знаходзіцца пад пільным наглядам 12 медыцынскіх брыгад.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■



Фота БЕЛТА.

■ Нарыхтоўкі

# БРУСНІЦЫ — УЖО З СЯРЭДЗІНЫ ЖНІЎНЯ

## Спецыялісты лясной гаспадаркі Мінлясгаса паведамляюць, што збіраць брусніцы ў Беларусі можна будзе з другой паловы жніўня, а потым праз два тыдні — і журавіны

**У Брэсцкай і Гомельскай абласцях збіраць брусніцы дазволена з 15 жніўня, у Гродзенскай і Мінскай — з 18-га, у Віцебскай і Магілёўскай — з 20 жніўня. Крыху пазней паспяваюць у нас і журавіны, якія ў Брэсцкай вобласці можна будзе збіраць з 27 жніўня, на Гомельшчыне — з 28 жніўня, а ў Гродзенскім рэгіёне — з 1 верасня.**

Збор журавін у Мінскай і Магілёўскай абласцях дазволены з 3 верасня, а ў Віцебскай — з 6-га. Эксперты Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адзначаюць, што сёлета прагназуецца сярэдні і дзесьці нават высокі ўраджай ягад і грыбоў. Пры гэтым яны нагадваюць, што цікавае паляванне павінна ажыццяўляцца спосабамі, якія не прычыняць шкоды ні раслінам, ні грыбніцы. Аматары лясных далікатэсаў павінны ведаць, што ў нашай краіне забаронены збор ягад рознымі механічнымі прыстасаваннямі. За збор або нарыхтоўку дзікарослых ягад і грыбоў на тэрыторыі, дзе такія нарыхтоўкі або збор забаронены, за парушэнне ўстаноўленых тэрмінаў, прымяненне забароненых сродкаў, метадаў збору або нарыхтоўкі дзікарослых ягад і грыбоў прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у выглядзе папярэджання або накладання штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

# ПА ЛІТОЎСКАЙ ГРОДЗЕНСКАЙ ВУЛІЦЫ...

**Больш за 150 аматараў бегу паўдзельнічаюць 10 ліпеня ва ўжо традыцыйным марафоне дружбы «Друскінінкай — Гродна». Гэта адзіны трансгранічны марафон у Еўропе, які праходзіць праз сапраўдную мяжу.**

Жаданне пераадолець марафонскую дыстанцыю ў 42 кіламетры 195 метраў паміж гарадамі-пабрацімамі сёлета разам з беларускімі і літоўскімі лёгкаатлетамі выказалі госці з Расіі, Украіны, Польшчы, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Германіі, Эстоніі, Нарвегіі і нават Катара. Яны стартуюць з цэнтральнай плошчы Друскінінкая і праз Гродзенскую накіроўцца ў бок пагранічнага пераходу «Райгардас — Прывалка». Усе пагранічныя і мытныя працэдуры робяцца загадзя і таму праверка дакументаў на мяжы падчас марафону не ажыццяўляецца. Фініш — на тэрыторыі цэнтральнага спартыўнага комплексу «Нёман» у Гродне.

Вынікі марафону (сярод мужчын і жанчын) падвядуць у чатырох узроставых катэгорыях: 18-39, 40-49, 50-59 і больш за 60 гадоў. Усіх удзельнікаў, якія фінішуюць на працягу кантрольнага ліміту часу (6 гадзін), узнагародзяць медалямі, а пераможцаў і прызёраў па ўзроставых групах — каштоўнымі прызамі і дыпломамі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### У ПАРКАХ АЛКАГОЛЬ НЕ ПРАДАЕМ

**Абмежаваць рэалізацыю алкаголю і тытуню ў паркавых зонах плануецца ў найбліжэйшы час. У сталічным Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага такая мера ўжо дзейнічае.**

Не толькі захады па абмежаванні даступнасці алкагольных напояў, але і шэраг заканадаўчых ініцыятыў, асветніцкіх мерапрыемстваў, скіраваных галоўным чынам на прафілактыку злоўжывання алкаголем, прадугледжаны дзяржаўнай праграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2016–2020 гады. Паводле слоў **галоўнага нарколага Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Івана КАНАРАЗАВА**, распрацоўваецца таксама пытанне аб абмежаванні рэалізацыі алкаголю паблізу ўстаноў аховы здароўя, адукацыі, спорту і культуры.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: АД СТАРАЖЫТНАСЦІ — ДА СУЧАСНАСЦІ

**Як патлумачыла прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія Барадун, у наступным годзе школу будуць заканчваць навучэнцы, якія ў 9-м класе выпускны экзамен па гэтым прадмеце не здавалі. Таму на выхадзе са школы ў адзінаццацікласнікаў правераць засваенне курса гісторыі Беларусі ад старажытных часоў і да нашых дзён.**

Два апошнія гады адзінаццацікласнікі дэманстравалі веданне гісторыі Беларусі толькі з 1917 года і да нашых дзён, паколькі ў 9-м класе імі быў здадзены выпускны экзамен за перыяд ад старажытных часоў да 1917 года. Юлія Барадун дадала, што змяненняў у пераліку вучэбных прадметаў, па якіх праводзяцца выпускныя экзамены, і формах іх правядзення ў 2016/17 навучальным годзе не прадугледжваецца.

Пасля 9-га класа выпускнікі базавай школы будуць здаваць тры экзамены: па беларускай мове (дыктант), рускай мове (дыктант) і пісаць кантрольную работу па матэматыцы. Адзінаццацікласнікі здаюць чатыры выпускныя экзамены: па прадметах «Беларуская мова» або «Руская мова» (па выбары) у пісьмовай форме (пераказ), «Матэматыка» — у пісьмовай форме (кантрольная работа), «Замежная мова» (у вуснай форме) і «Гісторыя Беларусі» (у вуснай форме).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### УТАІЛІ 80 ТЫСЯЧ КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ ТКАНІНЫ

**Гродзенскія мытнікі спынілі спробу незаконнага перамяшчэння буйной партыі тканіны, кошт якой папярэдне ацэньваецца ў 400 тысяч рублёў.**

На тэрыторыю Еўразійскага эканамічнага саюза тавар перавозіўся грузавым аўтамабілем з Літвы праз пункт пропуску «Бенякони». У дакументах было заяўлена 649 рулонаў тканіны — 147 тысяч квадратных метраў. Аднак... Яшчэ 351 рулон (80 тысяч квадратных метраў), як выявілі супрацоўнікі аддзела па барацьбе з кантрабандай, утаілі. Імпарцёр хацеў знізіць мытныя плацяжы прыкладна на 100 тысяч беларускіх рублёў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### УПАЛА Ў КЛУБЕ Ў ПАДВАЛ

**У сталіцы наведвальніца караоке-клуба правалілася ў падвальнае памяшканне.**

Здарэнне адбылося пасля апоўначы ў забаўляльнай установе па праспекце Пераможцаў. Дзяўчына 1997 года нараджэння, студэнтка трэцяга курса адной са сталічных ВНУ, упала з узроўню першага паверха ў падвальнае памяшканне разгрузачнай рампы будынка вышынёй 6 метраў і дыяметрам 10 метраў. Ратавальнікі пагрузілі пацярпелую на насілкі і перадалі медыкам. Дзяўчыну шпіталізавалі з меркаваным дыягназам «удар галаўнога мозга» і траўмамі.

### «ЯГУАР» «ВЫНЕС» З БЕЛАРУСІ

**Грамадзяніну Арменіі, які разагнаў у пачатку месяца ў сталіцы свой «Ягуар» да хуткасці 179 кіламетраў у гадзіну, адмоўлена ва ўездзе ў Беларусь на пяць гадоў. Апроч таго, яму прызначаны штраф у 735 рублёў.**

Экіпаж ППС зафіксаваў перавышэнне хуткасці паблізу дома №106 па вуліцы Прытыцкага, калі кантраляваў хуткасны рэжым. Машыну спынілі. За яе рулём быў грамадзянін Арменіі 1982 года нараджэння. Віду на грамадзянства ў яго не было. Высветлілася, што раней кіроўца ўжо каля 20 разоў парушаў правілы дарожнага руху на тэрыторыі нашай краіны. У 2012 годзе яго на тры гады пазбавілі права кіравання за ваджэнне ў Мінску нападпітку. З таго часу беларускія правы мужчына так і не аднавіў, хоць армянскія ў яго былі. На словах ліхача, ён перавысіў хуткасць з-за спартыўнага інтарэсу: вырашыў паспаборнічаць з матацыклістам, аднак інспектары ДПС такога не бачылі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЧЫРВОНАЕ ПОЛЕ


Зараз галінка, а будзе елка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наогул, мы шмат увагі ўдзяляем навядзенню парадку на зямлі. Наш раён моцна пацярпеў ад аварыі на ЧАЭС, большая частка насельніцтва пакінула яго межы. Але зараз ідзе адраджэнне.

**— Наколькі раёнам цікавяцца інвестары?**

— Пасля таго, як летась уступіў у сілу Указ №235 і запрацавала праграма па развіцці Паўднёва-ўсходняга рэгіёна, у нас зарэгістравана 3 фермерскія гаспадаркі. Ёсць прыклады рэгістрацыі прыватных прадпрыемстваў, але яны невялічкія і накіраваны на тую сыравінную магчымасць, якая маецца ў раёне — дрэваапрацоўку. У нас ёсць добрыя працоўныя рэсурсы, але яны не цалкам загружаны. Нядрэнна было б стварыць прадпрыемства з колькасцю каля 100 працоўных месцаў або філіял буйнога прадпрыемства. Для таго, каб пачаць тут свой бізнес, ёсць усё.


Сям'я Старавойтавых ужо сёлета плануе справіць наваселле (фота з архіва Старавойтавых).

## Бізнес на пенаблоках

Чакаецца, што Указ дапаможа працы мясцовага жылкамунгаса.

— Мы распрацавалі бізнес-план па засваенні новага віду прадукцыі і адправілі ў Банк развіцця на ўзгадненне. Спадзяёмся, што нас уключаць у праграму. Будзем вырабляць пенаблокі не толькі для сябе, але і прадаваць у іншыя раёны. Да таго ж паявіцца 5 новых працоўных месцаў, — кажа **галоўны інжынер прадпрыемства Вячаслаў ПУХНАТАЎ.**

За кошт асваення новага віду прадукцыі жылкамунгас плануе паменшыць свае выдаткі на будаўнічыя работы. Тут збіраюцца прымяніць яго на рэканструкцыі кацельнай, іншых аб'ектаў.

Палітыка камунальнага прадпрыемства накіравана на мадэрнізацыю і ўдасканаленне форм працы. На яго балансе знаходзіцца жыллёвы фонд раёна, сетка комплексных прыёмных пунктаў, кацельныя ў гарадскім пасёлку і ў сельскай мясцовасці і іншае. І трэба, каб усё гэта эфектыўна функцыянавала.

— Для зніжэння выдаткаў мяняем помпы і катлы на больш энергаэфектыўныя. Праводзім замену цеплатрас, робім цеплавую мадэрнізацыю жылфонду, аказваем паслугі за межамі раёна. Напрыклад, можам пракласці водаправод, каналізацыю, зрабіць адмостку, рамонт цокаля. Да нас звяртаюцца, каб скласці гараж. Наогул паслугі аказваем, пачынаючы ад пакосу травы, заканчваючы рытуальнымі, — дадае галоўны інжынер.

А яшчэ жылкамунгас займаецца ўпрыгожваннем райцэнтра рознымі малымі архітэктурнымі формамі. Прычым на дастаткова высокім узроўні. Не адразу можна здагадацца, што гармата, якая адлівае на сонцы металічным бляскам, зроблена з... дрэва. У майстроў з цэха дрэваапрацоўкі атрымліваюцца вельмі прыгожыя і зручныя альтанкі, лаўкі, розныя дэкаратыўныя элементы.

Прыемна яшчэ і тое, што адзін з супрацоўнікаў жылкамгаса атрымаў магчымасць асабіста скарыстацца перавагамі 235-га Указа. Ён стаў адным з тых шчаслівачыкаў, якія ўвайшлі ў лік забудоўшчыкаў 40-кватэрнага дома і атрымаюць ільготны крэдыт пад 1%. Ёсць спадзяванні, што аб'ект будзе ўзведзены ўжо сёлета. Вячаслаў Старавойтаў разам з жонкай выхоўвае траіх дзяцей. Пасля двух сыноў сёлета нарадзілася доўгачаканая дачка.

**Мы зразумелі, што нават у такім становішчы, як наша (аддаленасці ад абласнога цэнтра, ад чыгуначных шляхоў і гэтак далей) можна развівацца і працаваць з прыбыткам.**

— Свайго жылля мы не маем, жывём пакуль у цешчы, месца мала. Лічу, што нам вельмі пашчасціла з будучай кватэрай. Атрымаць крэдыт на 20 гадоў пад 1% — гэта, лічы, дарма, — радуецца ён.

Маладым сем'ям грэх скардзіцца на тое, што ў раёне няма куды схадзіць або няма дзе адпачыць. Сёлета адкрылася першая чарга фізкультурна-аздараўленчага комплексу з дзіцячым аквапаркам, да паслуг добрая лазня. Ёсць музей, народны тэатр, нават свой фестываль — «Тэатральныя вечарыны».

## Лясгас чакае партнёраў

Ад аварыі на ЧАЭС краснапольскія лясы пацярпелі больш за астатніх, але за апошнія 30 гадоў тут навучыліся абясшкоджваць драўніну.

— У нас ёсць пункт радыяцыйнага кантролю са спецыялізаваным абсталяваннем, спецыяліст, адказны за адбор проб, — можна не асцерагацца за бяспечнасць лясного багацця, — запэўнівае **Аляксандр ПАДАБЕД, галоўны ляснічы Краснапольскага лясніцтва.** — У тых месцах, дзе назіраюцца перавышэнні нормаў па радыяцыі, мы не вядзём работы. А яшчэ аказваем паслугі насельніцтву па праверцы дароў лесу і дзічыны.

Лясгас уносіць сваю лепту ў рэалізацыю праграмы па развіцці паўднёвага ўсходу. Летась у вёсцы Кажамякіна была запушчана новая лінія па перапрацоўцы драўніны. Пашырыліся магутнасці вытворчасці і з'явілася 10 новых працоўных месцаў. А разам з тым узраслі экспарт і прыбытак.

— Экспартуем прадукцыю ў Германію, Бельгію, Эстонію, Латвію, — кажа галоўны ляснічы. — Наладзілі перапрацоўку адходаў. Аполак здрабняем у тэхналагічныя трэскі і адпраўляем у Эстонію. Там іх выкарыстоўваюць для ацяплення. Ёсць доўгатэрміновыя кантракты. Прадукцыя, якую мы вырабляем у цэху дрэваапрацоўкі, прыносіць каля 1,5 мільярда рублёў (у пераліку на старыя грошы).

Нават у няпростых эканамічных умовах у лясгаса атрымліваецца эканоміць. На тэрыторыі Нівіцкага лясніцтва закончылася будаўніцтва лясной дарогі. Яна абышлася ў 4,6 мільярда рублёў, але ў выніку паменшацца выдаткі на вываз драўніны. Дарога дасць магчымасць скараціць шлях у межах лясніцтва на 17 кіламетраў. Увогуле плячо вывазкі з аднаго лясніцтва ў другое паменшыцца на 30 кіламетраў.

Цяпер лясгас аб'явіў конкурс на будаўніцтва сушыльнай гаспадаркі ў дрэваапрацоўчым цэху. Гэта дазволіць атрымаць прадукцыю з павялічанай дабаўленай вартасцю. Ужо заключаны дагавор з праектнай арганізацыяй. Рэалізацыя праекта абыдзецца прадпрыемству ў 1 мільярд рублёў з улікам дэнамінацыі.

— Указ №235 даў адчувальны штуршок у развіцці, — разважае Аляксандр Падабед. — Мы зразумелі, што нават у такім становішчы, як наша (аддаленасці ад абласнога цэнтра, ад чыгуначных шляхоў і гэтак далей), можна развівацца і працаваць з прыбыткам. Калі чалавек мае намер працаваць, яго не спалохае нішто. Мы зацікаўлены ў партнёрах, якія заняліся б рэалізацыяй нашых піламатэрыялаў. Мы ў сілах справіцца з нарыхтоўкай, але ў вытворчасці канчатковай прадукцыі не хапае цікавасці прыватнага бізнесу. Стварэнне дрэваапрацоўчага кластара вельмі было б дарэчы.



Драўляная гармата як сапраўдная.

## Залатое насенне

Лясгас таксама займаецца вырошчваннем саджанцаў і рэалізацыяй іх на экспарт. Летась атрымалася прадаць на 762 мільёны рублёў, сёлета за паўгода — на 430 мільёнаў. Ёсць дагаворы, па якіх краснапальчане вырошчваюць прадукцыю на экспарт у Расію. Цяпер там вельмі вялікі попыт на лесаўтваральныя пароды — сасну, елку, дуб, ясень. Вясной нават было перавышэнне яго над прапановай.

Пад вокнамі адміністрацыйнага будынка лясгаса набірае моц мінідэндрарый. Ёсць задумка зрабіць дарожкі з пліткі такім чынам, каб з вышыні птушынага палёту гэта нагадвала елку. У выглядзе ліста будуць зроблены і прагулачныя сцяжынкі на тэрыторыі Нівіцкага лясніцтва, дзе ёсць прыгожы вадаём.

Першыя дрэўцы ў дэндрапарку былі закладзены ў 2004 годзе, а ініцыятарам гэтага стаў былы старшы ляснічы Сяргей Мілузнікаў. Цяпер гэта прыгожая зона для адпачынку, дзе вока радуюць розных відаў ядлоўцы, елкі, лістоўніцы. Тут жа непадалёку знаходзяцца тарфяныя градкі, якія ўзніклі ў выніку абмену вопытам з фінамі. Маленькія парасткі мала чым пакуль нагадваюць сасну. Але і для іх прыйдзе свой час. Крыху далей у парніку спеюць нашы будучыя лясы, як красамоўна выказаўся галоўны ляснічы. Штогод лясгас збірае да 12 тон шышак, з якіх атрымліваецца 110-120 кілаграмаў насення. Клапатлівая рука пасадзіць іх у зямлю і аднойчы на паверхню праклюнуцца будучыя дрэўцы. Але спатрэбіцца яшчэ 80 гадоў, каб яны пайшлі ў справу. Тутэйшыя школьнікі не на словах ведаюць, як складана вырасціць дрэва. Пры кожным лясніцтве лясгаса існуюць так званыя школьныя лясніцтвы, якія дапамагаюць збіраць насенне, рабіць шпакоўні. А ў летні час падлеткі маюць магчымасць яшчэ і зарабіць, працуючы ў спецыяльных брыгадах. Летась, напрыклад, школьнікі за 14 дзён работы атрымалі па 1,1 мільёна рублёў (110 рублёў па-новаму) кожны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*Краснапольскі р-н.*

**Фота аўтара.**

### Даведка «Звязды»

**Краснапольскі раён займае плошчу 1220 квадратных кіламетраў, знаходзіцца за 120 кіламетраў ад Магілёва. Мяжуе са Слаўгарадскім, Чэрыкаўскім, Клімавіцкім, Касцюковіцкім раёнамі Магілёўскай вобласці, Чачэрскім і Кармянскім Гомельскай і Краснагорскім з боку Расіі. Гістарычная назва Краснаполля — Маластоўка. Цяперашняе яго найменне мае два варыянты тлумачэння. Першы звязаны з Паўночнай вайной, калі тут ішлі крывапралітныя баі паміж войскамі Пятра I і шведскага караля Карла XII. А другі — з вялікімі пакладамі ў раёне чырвонай гліны.**

**Да аварыі на Чарнобыльскай АЭС на тэрыторыі раёна пражывала 23 800 жыхароў. Зараз — 9960, з іх каля 5 тысяч непасрэдна ў Краснаполлі. Раён лічыцца сельскагаспадарчым. Прыярытэтнымі кірункамі ўкладання інвестыцый з'яўляюцца дрэваапрацоўчая галіна, вытворчасць цэглы, разліў пітной і мінеральнай вады, а таксама безалкагольных напояў, арганізацыя вытворчасці па выпрацоўцы аднаўляльных крыніц энергіі і па перапрацоўцы другасных рэсурсаў. Тут зацікаўлены ў адкрыцці прадпрыемства па аказанні транспартна-лагістычных паслуг, паслуг прыдарожнага сэрвісу і сэрвіснага абслугоўвання аўтамабіляў, арганізацыі вытворчасці па выпуску тавараў лёгкай прамысловасці (швейныя вырабы), вытворчасці паліўных гранул з саломы, сельскагаспадарчай вытворчасці. Для рэалізацыі праектаў у Краснаполлі і раёне падрыхтаваны 15 інвестпляцовак.**

■ Будзь у курсе!

## Адкрываецца рух на Каўнас

Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» з 7 ліпеня адкрывае рух аўтобусаў па міжнародным маршруце Мінск — Каўнас праз Ашмяны, Вільнюс, Вевіс, Каўнас. Адпраўляцца рухомы састаў будзе: з Мінска ад АВ «Цэнтальны» ў 23.30 па чацвяргах, пятніцах, суботах і нядзелях; з Каўнаса ў 18.40 па пятніцах, суботах, нядзелях і панядзелках. Толькі для рэйсаў адпраўленнем з Мінска будзе арганізаваны падвоз пасажыраў да аэрапортаў Вільнюса і Каўнаса, дзеля чаго ўводзяцца тарыфныя пункты «Вільнюс-Аэрапорт» і «Каўнас-Аэрапорт».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует о продлении срока размещения облигаций банка 175 и 177 выпусков, номинированных в иностранной валюте, а также 190–193 выпусков, номинированных в белорусских рублях, по 06.07.2017.

Изменения в эмиссионные документы указанных выпусков зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 04.07.2016.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
7 ЛІПЕНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15796)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Юныя зоркі



## Насця ЖАБКО:
# «Без музыкі ўжо нікуды»

**Юная спявачка прадставіць Беларусь на XIV Міжнародным дзіцячым конкурсе «Віцебск-2016»**

**Гэты год для 10-гадовай мінчанкі Насці Жабко выдаўся вельмі складаным. Яна на адны дзясяткі скончыла пачатковую школу ў сталічнай гімназіі №16, таксама на дзясяткі здала ўступныя дзяржаўныя экзамены ў гімназію, паспяхова вучыцца ў музычнай школе №10 імя Глебава. Ды і зараз, калі ўсе дзеці бавяцца падчас летніх канікулаў, Насці не да адпачынку. Яна рыхтуецца прадставіць нашу краіну на дзіцячым конкурсе «Віцебск-2016», што пройдзе ў рамках «Славянскага базару». Штодзённыя заняткі па вакале і харэаграфіі, курсы акцёрскага майстэрства і гадзіны трэніровак на трэнажорах. Разам з дзяўчынкай да конкурсу рыхтуецца і ўся сям'я. Яны — вялікая і дружная каманда, і можна сцвярджаць, што менавіта з сям'і бярэ выток зацікаўленасць спявачкі музыкай. Бабуля Насці — вядомы дзіцячы кампазітар, аўтарка многіх песень і зборнікаў для дзяцей Яніна Жабко, а старэйшы брат Глеб — прафесійны педагог па вакале. Менавіта ён рыхтуе сястру да выступлення на конкурсе.**

*— Як так атрымалася, што Насця яшчэ ў досыць юным узросце пачала прафесійна займацца музыкай?*

**Глеб:** — У нас сям'я музыкантаў. І тое, што Насця — «музычнае дзіця» стала зразумела, як толькі яна сказала першыя словы. Спачатку пачыналі спяваць просценькія песенькі, часта гэта была бабуліна творчасць. А потым мы ўсе заўважылі, што яна мае досыць вялікі талент да спеваў.

*— Першым настаўнікам Насці быў Пётр Ялфімаў?*

**Глеб:** — Так, я вучыўся ў Пятра яшчэ, калі быў студэнтам Інстытута сучасных ведаў імя Шырокава. Насцю таксама прывёў да свайго настаўніка, тады ёй было 6 ці 7 гадоў. З Пятром яны працавалі прыкладна год. Потым эстафету Насцінага настаўніка пераняў я. Выкарыстоўваю і веды, што атрымаў ад Пятра, і іншы вопыт, бо навучаўся класічнаму акадэмічнаму вакалу. Вопыт працы з Насцяй — бясцэнны, ён уключае і стасункі ў сям'і, разуменне яе характару. Таксама добрай настаўніцай для сястры была Анастасія Малашкевіч, яе школа і метады выкладання дапамаглі і мне.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

У ліку найлепшых

# ВІНШУЕМ, ПЕРАМОЖЦЫ!

**«ЧЫРВОНКА. ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА» АБВЯШЧАЕ ВЫНІКІ ТВОРЧАГА КОНКУРСУ**

**Сёння мы падвядзём вынікі нашага чарговага творчага спаборніцтва сярод юных і маладых няштатных аўтараў «Я — малады! І мне не ўсё роўна!..», якое доўжылася цягам навучальнага года. Але перш чым назваць імёны пераможцаў, па традыцыі коратка прааналізуем яго ход і вынікі.**

**Усяго на конкурс паступіла больш за 40 творчых работ. На старонках «Чырвонкі. Чырвонай змены» было апублікавана (разам з работамі, якія друкуюцца сёння) 12 лепшых, па-сапраўднаму журналісцкіх «проб пяра». Прыкладна столькі ж допісаў было (і яшчэ будзе) змешчана на старонках маладзёжнага дадатку ў якасці звычайных газетных матэрыялаў. Адбылося гэта з той прычыны, што згаданыя «пробы пяра» не адпавядалі ўмовам конкурсу найперш з-за абранай аўтарамі тэмы, але тым не менш былі вартымі ўвагі — і нашага журы, і, спадзяёмся, чытачоў. Яшчэ колькі дасланых на наша творчае спаборніцтва работ знайшлі свае месца пад рубрыкай «З пошты «ЧЗ». Такім чынам, з агульнай колькасці атрыманых намі «проб пяра» было надрукавана больш за палову. Гэта неблагі вынік, лічым, усе ахвотныя паўдзельнічаць у конкурсе добра папрацавалі, тым больш што некалькі аўтараў даслалі не па адной рабоце.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*




Фота Ільі КАЦУСАВА.

Двое з трох пераможцаў творчага конкурсу: Настасся Гарост (злева) і Дар'я Свірыда.

Пераемнасць пакаленняў

## Андрэй БЕЛЯКОЎ:
# «Патрыятызм — не захапленне знешнімі рэчамі».

**За ім павінна стаяць глыбокае веданне гісторыі, традыцый і культуры свайго народа**



**У савецкія часы мы, старэйшае пакаленне «Чырвонкі», з маленства адчувалі сябе патрыётамі. Шчыра ганарыліся чырвоным піянерскім гальштукам і з азартам гулялі ў «Зарніцу» і «Арляня». Імкнуліся заслужыць права першымі ўступіць у камсамол. Але, апроч ідэалагічнага складніка, як цяпер гавораць, у тагачасных падлеткаў была і простая чалавечая неабыякавасць да таго, што адбывалася ў свеце. Мы збіралі ў школе пасылкі для равеснікаў з Нікарагуа. Вельмі перажывалі за тых, хто перажыў у Арменіі землятрасенне. Потым з хваляваннем назіралі за вывадам савецкіх войскаў з Афганістана... Пра патрыятычныя каштоўнасці ў жыццёвых прыярытэтах сучаснай моладзі мы гутарым з першым сакратаром ЦК БРСМ Андрэем БЕЛЯКОВЫМ.**

*— Андрэй Эдуардавіч, даўно няма вялікай краіны, для грамадзян якой інтэрнацыяналізм не быў пустым гукам. Як вы думаеце, сучаснае маладое пакаленне гэтак жа гатова спачуваць чужому гору і прыйсці, калі спатрэбіцца, на дапамогу?*

— Мяркую, што параўнанне пакаленняў — проста непазбежнае ва ўсе часы. Таму нельга крыўдзіцца, а трэба справамі даказваць, што моладзь здольная вырашаць самыя сур'ёзныя задачы. Вы пытаецеся пра вельмі важныя маральныя якасці. Ці ўласцівыя яны маладому пакаленню? Безумоўна, прывяду толькі адзін прыклад: наш валанцёрскі рух «Добрае сэрца» аб'ядноўвае па ўсёй краіне больш як 30 тысяч юнакоў і дзяўчат. Поле іх дзейнасці — дапамога ветэранам, адзінокім немаладым людзям, работа з дзецьмі-сіротамі, дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, падтрымка людзей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, а таксама маюць патрэбу ў дарагіх аперацыях. Візітнай карткай валанцёрскага руху стаў дабрачынны марафон «Усе фарбы жыцця для цябе» і Дні дабра. У Год моладзі, напрыклад, падчас правядзення дабрачынных марафонаў валанцёры сабралі і пералічылі адрасную дапамогу тым, хто меў у ёй патрэбу, на суму больш як 185 мільёнаў рублёў.

Яшчэ адзін накірунак валанцёрскай дзейнасці — праект «Аднаўленне святынь Беларусі». За тры гады добраўпарадкавана больш як 530 аб'ектаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 07 2016 г.

У адным страі

## З АДКРЫЦЦЁМ, ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ!

**Сёння адбылося ўрачыстае адкрыццё трэцяга працоўнага семестра на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы.**

На ўзвядзенні аб'ектаў Беларускай атамнай электрастанцыі будзе задзейнічаны зводны міжнародны студэнцкі атрад імя двойчы Героя Савецкага Саюза маршала Міхаіла Іванавіча Крылова. У яго састаў увойдуць 5 лінейных будаўнічых атрадаў з Расіі і 18 будатрадаў, сфарміраваных на базе ўстаноў адукацыі Беларусі. Таксама будуць задзейнічаны грамадзяне Казахстана. Агульная колькасць студатрадаўцаў складзе 428 чалавек. У прыватнасці, байцы будуць выконваць бетонныя і каменныя работы, розныя віды арміравання, дарожныя і геадэзічныя работы, займуцца мантажом металаканструкцый і цеплаэнергетычнага абсталявання. З кожным удзельнікам студэнцкага атрада заключаны тэрміновы працоўны або грамадзянска-прававы дагавор, праведзены інструктаж. Хлопцы будуць забяспечаны спецвопраткай, спецабуткам, сродкамі індывідуальнай абароны. Студатрадаўцаў чакае насычаная культурная і спартыўная праграма. Пройдуць турніры па футболе, валейболе, баскетболе. Для ўдзельнікаў студатрадаў будуць арганізаваны экскурсіі па Астраўцы, паездка ў аграгарадок Гервяты на канцэрт арганнай музыкі ў касцёл Святой Тройцы, падарожжа па гістарычных мясцінах Беларусі і іншае. Урачыстае закрыццё трэцяга працоўнага семестра на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі запланавана на 26 жніўня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

Аднагодкам

## НЕ ПАМЫЛІЦЦА З ВЫБАРАМ

**Для многіх летнія месяцы — час адпачынку. Але для цяперашніх выпускнікоў — гэта гарачы час паступлення ў вышэйшыя ці сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, момант выбару жыццёвага шляху.**

— Вельмі хвалявалася, калі год таму паступала ва ўніверсітэт, — успамінае мая знаёмая, студэнтка першага курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. — Думала, што будзе вельмі складана, асабліва першы час. Усё ж такі новыя людзі, выкладчыкі. Але аказалася ўсё зусім не так, як я сабе ўяўляла. Новая абстаноўка пайшла мне толькі на карысць, я знайшла шмат новых сяброў. У сталіцы стала лепш арыентавацца. Але не варта надта расслабляцца. Ва ўніверсітэце ўсё нашмат больш сур'ёзна, чым у школе. Вучыцца досыць няпроста, але вельмі цікава. Хачу дадаць, што важна выбраць навучальную ўстанову і спецыяльнасць, якія вам даспадобы. Бо ад вашай вышэйшай адукацыі будзе залежаць будучая прафесія, якая павінна прыносіць не толькі добры заробак, але і станоўчыя эмоцыі, маральнае задавальненне.

...Я таксама сёлета выпусцілася са сцен сваёй Мар'інагорскай гімназіі. З выбарам будучай прафесіі вызначылася досыць даўно, хоць і ішла да яго маленькімі крокамі, узважваючы кожны бок сваёй будучай спецыяльнасці. Жадаю кожнаму выпускніку 2016 года паспяхова паступіць у выбраную ўстанову, выйсці з яе сцен кваліфікаваным спецыялістам, а самае галоўнае — знайсці сваё месца ў жыцці.

**Кацярына ГРУША,**
**выпускніца**
**Мар'інагорскай гімназіі.**

# «Патрыятызм — не захапленне знешнімі рэчамі»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— БРСМ часта параўноўваюць з камсамолам. Для прадстаўнікоў гэтай арганізацыі былі вельмі важныя таварыскасць, узаемная падтрымка, якія, дарэчы, і па сённяшні дзень аб'ядноўваюць камсамольцаў усіх часоў...***

— Камсамол быў вельмі добрай школай жыцця, якая фарміравала асобу і прафесіянала. Моцным бокам гэтай маладзёжнай арганізацыі я лічу сістэму падрыхтоўкі і выяўлення кадраў, выразную структуру і строгую дысцыпліну. Гэта была выдатная школа лідараў. І мы лічым сябе спадчыннікамі лепшых традыцый камсамола. Адзін з камсамольскіх брэндаў — студатрадаўскі рух — нам удалося адрадзіць пры дапамозе дзяржавы. Студатрады — унікальная з'ява для замежных краін, дзе практыкуюцца зусім іншыя падыходы да працоўнага выхавання, там, дзе, у першую чаргу, развіты індывідуалізм. А студатрад — гэта грамадскае плюс асабістае. Я, але ўнутры калектыву. Што хаваць: моладзь сёння хоча зарабляць, новае пакаленне дастаткова прагматычнае, але студатрад — гэта, найперш, калектывісцкія каштоўнасці. І яны знаходзяць водгук у сучасных маладых людзей. У многія студатрады нават утвараецца конкурс. Сёння ў цэнтры нашай увагі знаходзіцца ідэалогія студатрадаўскага руху, таму што нам бы не хацелася, каб студатрад быў проста месцам, дзе зарабляюць грошы. Мы імкнёмся выхаваць у маладых людзей камандны дух. Тут значэнне мае ўсё, у тым ліку і атрыбутыка студатрадаўскага руху (пераходны сцяг, які атрымлівае лепшы студатрад па выніках трэцяга працоўнага семестра, курткі байцоў, шаўроны, песні), вызначэнне на дзяржаўным узроўні аб'ектаў, якія абвяшчаюцца рэспубліканскай, гарадской ці абласной маладзёжнай будоўляй. Вельмі важная роля адводзіцца лідарам — камандзірам і камісарам атрадаў. Многае залежыць ад іх здольнасці кіраваць калектывам, вырашаць агульныя праблемы... Упэўнены, што да гэтай работы трэба рыхтаваць маладых людзей мэтанакіравана.

***— А якое месца ў сістэме жыццёвых арыенціраў сучаснай моладзі займаюць патрыятычныя каштоўнасці? Ці праводзіла ваша сацыялагічная лабараторыя даследаванні на гэту тэму?***

— Лабараторыя «замярала» ў інтэрнэце ўзровень грамадска-патрыятычнага выхавання моладзі. Юнакам і дзяўчатам задалі пытанне: «Што такое патрыятызм у вашым разуменні?» І вось як размеркаваліся адказы нашых рэспандэнтаў: «Любоў да Радзімы, роднага горада, вёскі, дому» — так адказалі 40%. «Павага да сваёй Радзімы, гонар за сваю краіну» — 34%. «Любоў да нацыянальнай культуры» — 12%, «Любоў да сваёй сям'і і блізкіх» — 6%. «Імкненне да бяспечнага свету і сацыяльнай справядлівасці» — 5%. А 3% апытаных лічаць, што «ва ўмовах глабалізацыі патрыятызм губляе сваё значэнне».

Калі ўжо параўноўваць савецкія часы з сённяшнім днём, то ў сучаснай моладзі шмат інфармацыі. Калісьці праўдзівай інфармацыі было мала, затое было шмат міфаў. А сёння маладыя людзі маюць магчымасць вандраваць па свеце, выязджаць за мяжу на вучобу, стажыроўкі, што дазваляе паглядзець на нашу краіну збоку і аб'ектыўна ацаніць тое, што мы маем. Маладое пакаленне нарадзілася ўжо ў незалежнай Беларусі, і яно ведае пра вайну толькі са слоў сваіх прадзедаў. Стабільнасць у краіне мы ўсе ўспрымалі да апошняга часу як нешта належнае. Але свет вакол хутка змяняецца — ваенныя канфлікты ўспыхваюць паўсюдна. І раптам прыйшло разуменне, што мір — вельмі крохкая каштоўнасць, якая можа рассыпацца, як хрустальны кубак, у адно імгненне.

***— У год 70-гадовага юбілею Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне быў дадзены старт праекту «Кветкі Вялікай Перамогі». Раскажыце пра ваш новы праект «Музей-бус «Кветкі Вялікай Перамогі»...***

— Гэта сумесная ініцыятыва Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, скіраваная на патрыятычнае выхаванне моладзі, захаванне пераемнасці пакаленняў, клопат пра ветэранаў і фарміраванне ў падрастаючага пакалення актыўнай жыццёвай пазіцыі. Але вельмі хутка ідэя трансфармавалася. Перасоўная экспазіцыя музея была падзелена на дзве тэматычныя залы — Беларусь мірную і Беларусь ваенную. У першай зале — экспанаты, звязаныя з культурай, традыцыямі і самабытнасцю беларускага народа. А ў другой — нямыя сведкі падзей мінулай вайны: экспанаты, якія гавораць пра гераізм беларускага народа і гісторыю вызвалення нашай краіны. Мы зрабілі стаўку на інтэрактыўнасць, калі кожны ахвотны можа «дакрануцца да гісторыі», прымерыць, сфатаграфавацца з упадабаным артэфактам, прыняць удзел у майстар-класах па традыцыйных і сучасных народных рамёствах, арганізаваных на пляцоўцы каля стаянкі «Музей-буса».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У маі-чэрвені перасоўная выстава «Музей-бус» праехала па ўсіх абласных цэнтрах, а таксама прыняла ўдзел у святочных мерапрыемствах у сталіцы, прысвечаных Дню Незалежнасці. Па маршруце руху незвычайнага музея арганізоўваліся экскурсіі і фотавыставы на тэму вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, праходзіў «Дыялог пакаленняў». Да таго ж у многіх рэгіёнах, якія наведаў «Музей-бус», яго экспазіцыя папаўнялася мясцовымі экспанатамі часоў Вялікай Айчыннай вайны. На працягу ўсяго падарожжа мы чулі словы ўдзячнасці ад наведвальнікаў. Яны дарагога каштуюць. Людзі прыходзілі цэлымі сем'ямі, цікавіліся гісторыяй краіны, задумваліся і пачыналі вывучаць гісторыю сваёй сям'і, свайго роду. Значыць, праект быў задуманы нездарма, вынік ёсць.

**«Што хаваць: моладзь сёння хоча зарабляць, новае пакаленне дастаткова прагматычнае, але студатрад — гэта, найперш, калектывісцкія каштоўнасці».**

Прызнаюся, мы вельмі рады таму факту, што сімвал свята Перамогі, які прапанаваў Саюз моладзі, — кветка яблыні з чырвона-зялёнай стужачкай, прыжыўся ў нашым грамадстве. Яблыневая квецень увасабляе сабой непарыўную сувязь пакаленняў і шчырую ўдзячнасць воінам, што падарылі сваім нашчадкам магчымасць радавацца квітнеючым садам, якія сталі сімвалам новых мірных перамог суверэннай Беларусі. Мэта Саюза моладзі — аб'ядноўваць, знаходзіць кропкі для кансалідацыі грамадства. Таму мы рухаемся менавіта ў гэтым накірунку.

***— У нашай краіне вельмі шмат робіцца для захавання памяці пра Вялікую Айчынную вайну, але ж патрыятычнае выхаванне не зусім правільна зводзіць толькі да ваенна-патрыятычнага. Патрыятызм уключае ў сябе яшчэ і вывучэнне нацыянальнай культуры, літаратуры, гісторыі...***

— У Год культуры стартаваў наш новы сумесны з Саюзам пісьменнікаў Беларусі рэспубліканскі патрыятычны праект «Кніга.BY», скіраваны на фарміраванне ў моладзі патрэбы ў чытанні, у духоўным і інтэлектуальным росце. Праект рэалізуецца, перш за ўсё, у форме папулярнага ва ўсім свеце флэш-мобу «Буккросінг» і скіраваны на далучэнне моладзі да чытання кніг беларускіх аўтараў на роднай мове, на вывучэнне гісторыі суверэннай Беларусі. У месцах вялікай канцэнтрацыі моладзі ўстанаўліваюцца кніжныя паліцы буккросінгу, і любы ахвотны можа ўзяць у карыстанне кнігу, на якой змешчаны лагатып праекта і маецца ўкладыш з апісаннем алгарытму дзеянняў і ўнікальным ідэнтыфікацыйным нумарам. Таксама для моладзі арганізуюцца майстар-класы, семінары, тэматычныя «круглыя сталы», літаратурныя дыскусіі, сустрэчы з выдатнымі дзеячамі культуры, выступленні беларускіх пісьменнікаў.

Напярэдадні Дня Незалежнасці ў сталіцы прайшоў Дзень вышыванкі, адным з ініцыятараў і арганізатарам якога стаў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Мы проста не маглі не заўважыць магутную хвалю інтарэсу з боку моладзі да адзення з традыцыйнай вышыўкай. У нашы дні такое адзенне не толькі не страціла сваю актуальнасць, а стала нават своеасаблівай моднай «фішкай». Разам з тым вышыты нацыянальны арнамент — гэта не проста ўпрыгажэнне, стыльны аксесуар, а своеасаблівы шыфр, перададзены нам праз стагоддзі продкамі. Кожны ўзор у арнаменце — сімвал, які валодае магутнай энергетыкай і нясе пэўны пасыл. І хацелася, каб гэта ўсе разумелі, каб не было выключна вонкавага захаплення модным адзеннем, якое сёння актыўна прасоўваецца шматлікімі вытворцамі. Дарэчы, сярод іх ёсць і фіналіст нашага праекта «100 ідэй для Беларусі» — дызайн-цэнтр вышыўкі «Fainy.by». Каманда студэнтаў і выпускнікоў БНТУ стварае прыгожыя рэчы з беларускім арнаментам, напоўненым сэнсам. Хацелася б, каб усе зразумелі сакральны сэнс, зразумелі сваю сувязь з продкамі.

Я ўпэўнены, што за захапленнем знешнімі рэчамі, сімвалізмам, абавязкова павінна стаяць глыбокае веданне гісторыі сваёй краіны, культуры, а таксама мовы. Але я супраць таго, каб беларуская мова стала пляцоўкай для канфрантацыі. Падчас адкрытых дэбатаў, якія ладзіць БРСМ, прагучала наступнае пытанне: «Калі большая частка моладзі размаўляе на рускай мове, ці азначае гэта, што маладыя людзі не ідэнтыфікуюць сябе як беларусы?» Прыводзіліся звесткі сацыялагічнага апытання, падчас якога больш за 80 працэнтаў рэспандэнтаў адназначна заявілі, што яны беларусы. Таму мы лічым: трэба і далей развіваць праекты, звязаныя з гісторыяй, культурай і традыцыямі беларусаў, з папулярызацыяй мовы як важнага складніка самаідэнтыфікацыі народа. Але нельга нічога і нікому навязваць. Нашы дзеянні павінны быць далікатнымі і аб'ядноўваць, а не раз'ядноўваць людзей.

**«Вельмі важная роля адводзіцца лідарам — камандзірам і камісарам атрадаў. Упэўнены, што да гэтай работы трэба рыхтаваць маладых людзей мэтанакіравана».**

***— Саюз моладзі прымае актыўны ўдзел ва ўсіх выбарчых кампаніях. Напярэдадні — выбары ў парламент. Як вы лічыце, ці прыйдзе моладзь восенню на выбарчыя ўчасткі?***

— Мяркую, што многае будзе залежаць ад кандыдатаў — гэта павінны быць актыўныя людзі, якія змогуць завалодаць увагай моладзі. Яўка на выбарах напрамую будзе залежаць ад таго, наколькі актыўнай акажацца агітацыйная кампанія. Моладзь ва ўсім свеце — самая апалітычная частка грамадства, пры гэтым даволі актыўная і крэатыўная. Таму вельмі важна, каб яе энергію не выкарыстоўвалі ў дэструктыўных мэтах.

Самае важнае, чаму вучыць моладзь удзел у выбарчай кампаніі, — гэта адказнасць. Маладыя людзі павінны разумець адказнасць не толькі за свой лёс, але і за лёс сваёй краіны. Яны не павінны быць інфантыльнымі, у іх павінен быць стрыжань. Мы павінны прыкладаць усе намаганні, каб малады чалавек усвядоміў, што выключна росквіт краіны — залог дабрабыту кожнага беларуса. Што людзі, якіх мы сёння выбіраем у парламент, будуць заўтра прымаць законы, ад якіх напрамую залежыць наша жыццё. Безумоўна, нам бы хацелася, каб у парламенце былі прадстаўлены і члены нашай арганізацыі. Іх мы адназначна будзем падтрымліваць.

**Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Рука творцы*

# ЛЮБІМЫЯ КОНІ ЮНАЙ МАСТАЧКІ

**Мала хто ў свае 15 гадоў можа пахваліцца нейкім значным дасягненнем. А выхаванка народнай студыі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Палаца культуры Маладзечна Анастасія Надудзік можа. Нядаўна тут адкрылася яе выстава «Краявіды з конькамі».**


Фота Святланы КІСЛАЙ.

Падчас адкрыцця экспазіцыі асаблівыя словы падзякі прагучалі ад мамы дзяўчынкі Вольгі Васілеўны. У іх сям'і юрыстаў ніхто не захапляўся маляваннем. А развіць талент Насці дапамагла кіраўнік студыі Галіна Сушко, якая адзначыла: «Усе, каму мы рабілі такія выставы, сталі мастакамі. Мяркую, што і Насцю чакае вялікая творчая будучыня. Тое, як яна працуе, у мяне выклікае толькі здзіўленне. Дзіця самастойна прыдумляе кампазіцыі, і яны вельмі складаныя».

І сапраўды. Карціны юнай мастачкі адлюстроўваюць шмат розных сюжэтаў. Тут можна ўбачыць і Напалеона каля вогнішча, і сядзібу Агінскага, і савецкага кавалерыста, які развітваецца з роднай вёскай перад адпраўкай на фронт. Усе аб'ядноўвае адна тэма — коні, любімыя жывёлы Насці.

«Дастаткова разнастайныя кампазіцыі, рэалістычныя коні, жывапісныя работы. Я лічу, што не дарма прыйшоў сюды. Атрымаў масу задавальнення ад выставы. Больш за ўсё спадабалася карціна, дзе намаляваныя белыя коні на фоне восеньскага пейзажу», — расказаў пра свае ўражанні навучэнец гімназіі-каледжа мастацтваў Аляксей Пакалюк.

Адну з наведвальніц, Ніну Дуброўную, так уразіла работа «Новы год прыйшоў», што яна захацела яе купіць: «Мне спадабалася гэтая карціна, таму што яна сімвалізуе Каляды, наступленне Новага года, надзею на нешта новае, лепшае, прыгожае. Уся прырода быццам замерла ў чаканні. Тут паказана радаснае дзіцячае светаадчуванне. Я хачу падарыць гэтую карціну сваёй пляменніцы, якая жыве ў Германіі».

Цяпер мастачка збіраецца стварыць серыю графічных работ. «Гэта будуць абсалютна выдуманыя вобразы, якія не паддаюцца якому-небудзь тлумачэнню», — дзеліцца планамі Анастасія.

Напрыканцы мерапрыемства дзяўчына падарыла ўсім сувеніры: выразаных з каляровай паперы конікаў з аўтографам юнай мастачкі. У падарунак ад народнай студыі яна атрымала альбом для эскізаў, які так даўно хацела, і сапраўдны каталог з яе малюнкамі.

**Дар'я СВІРЫДА, выпускніца 11 класа гімназіі №10 г. Маладзечна.**

*Асабісты прыклад*

# МОЙ САМЫ ЛЕПШЫ НАСТАЎНІК

**Прафесію настаўніка можна смела назваць адной з самых цяжкіх, адказных і ганаровых адначасова. Азіраючыся на гады вучобы ў ліцэі, я захацела расказаць пра свайго любімага настаўніка.**

Ніколі не забуду ўрокі гісторыі і грамадазнаўства, за якія я ўдзячная Фёдару Васілевічу Радзіонаву. Наш настаўнік уключае ў працу кожнага вучня, можа своечасова пажартаваць, каб зняць стомленасць, а можа здзівіць нечаканым прыкладам. Ён выдатны арганізатар і цудоўны артыст. У чым жа асаблівасць яго ўрокаў?

Па-першае, хто не гатовы — таму варта панервавацца, бо Фёдар Васілевіч выклікае да дошкі не па класным журнале, а пры дапамозе скрыначкі з бочачкамі. Адказвае вучань, нумар па спісе якога адпавядае нумару бочачкі. А пакуль адказчык рыхтуецца каля дошкі, Фёдар Васілевіч гуляе з астатнімі ў «паравозік». Гэтая гульня ўяўляе сабой пытанні, што задае настаўнік, на якія вучні адказваюць па чарзе: калі першы не ведае адказу, то пытанне перадаецца наступнаму, — і так да канца рада. Такім чынам, вучні зарабляюць плюсы і мінусы. Вядома, спачатку нам было вельмі цяжка прывыкнуць да такіх урокаў, і я разам з аднакласнікамі заўсёды рыхтавалася да іх, ведаючы, што проста «адсядзецца» не атрымаецца.

Фёдар Васілевіч — настаўнік, які аддае сябе цалкам сваёй працы, вучням і прадмету. Ён заўсёды вучыў нас вылучаць галоўнае, умець выказваць свае думкі, быць заўсёды гатовымі змагацца за вынік. Я стала лепш разумець гісторыю, навучылася складаць кароткі план, які дапамагае адказваць на пытанні. Фёдар Васілевіч не толькі даў нам шмат ведаў, але і навучыў творча падыходзіць да таго ці іншага задання. Напрыклад, на першым уроку па грамадазнаўстве ён задаў кожнаму напісаць ліст-параду ананіму, які дапаможа яму справіцца з пэўнай праблемай. Для гэтага Фёдар Васілевіч расказаў нам тры гісторыі розных людзей. Гэта заданне было вельмі цікавым, бо мы апынуліся ў ролі псіхолага. Прачытаўшы нашы лісты, настаўнік сказаў, што мы добра справіліся з задачай і, магчыма, нашы парады дапамаглі б каму-небудзь. Такім чынам, мы вучыліся творча мысліць, разважаць, выходзіць з цяжкіх сітуацый. Цяпер я разумею, што такіх урокаў у мяне, магчыма, больш не будзе. Я вельмі рада, што мне давялося вучыцца ў такога Настаўніка.

**Ганна КУРТАСАВА, выпускніца 11 класа ліцэя №2 г. Мінска.**

*Камертон настрою*

# «Мова — гэта частка мяне»



**У сеціве пра Стася Сілку кажуць, што ён прыйшоў, каб заваяваць сэрцы мільёнаў жанчын. Ці сапраўды гэта так? Малады выканаўца родам з Наваполацка. Вершы і музыку для песень хлопец стварае сам, прычым выключна на беларускай мове. У адным з інтэрв'ю выканаўца пракаментаваў выбар пісаць на роднай мове так: «Гэта цалкам натуральная частка мяне. І калі я заўважыў, што атрымліваецца пісаць вершы і песні, то пытанне пра мову вырашылася вельмі хутка». Цяпер творчасць Стася набірае папулярнасць. Важным момантам у ёй стаў выхад дэбютнага альбома з цікавай назвай «Песні для глуханямых».**

***— Як доўга ты рыхтаваў яго?***

— Я не рабіў гэтага ў звыклым разуменні. Проста спяваў на канцэртах свае песні, пакуль аднойчы не паўстала пытанне, што трэба ісці далей. А каб рухацца наперад, трэба было адкінуць старыя песні і лепшым варыянтам было запісаць іх, каб яны былі зафіксаваныя, і можна было рабіць нешта іншае. У выніку мы запісалі ўсё за два дні, гэта вельмі хутка.

***— Ці ёсць ужо ідэі для новага альбома?***

— Ёсць. І мы працуем зараз над ім, але гэта вялікі сакрэт: што там будзе і як. Магу толькі сказаць, што ў новым альбоме ўсё атрымаецца максімальна непадобнае да таго, што я рабіў раней.

***— Як лічаш, абавязкова музыка павінен мець спецыяльную адукацыю?***

— Абсалютна не, галоўнае, хацець займацца музыкай. Хоць у мяне ёсць знаёмыя, якія маюць музычную адукацыю і ім крышачку прасцей. Прасцей іграць калектывам. Мне вельмі складана гэта даецца. Ім прасцей нешта патлумачыць: дзе памылкі, інтэрвалы розныя ці іншыя музычныя нюансы, якімі я не валодаю, бо не ведаю тэрміналогіі. Насамрэч у мяне ёсць музычная адукацыя, але я дрэнна вучыўся ў музычнай школе.

***— Ці важнае для цябе меркаванне іншых пра твае вершы?***

— Я пішу, як пішу. Ёсць некалькі аўтарытэтных для мяне людзей, якім я паказваю свае творы, і іх меркаванне для мяне важнае. Калі крытыка канструктыўная, то я прыслухоўваюся, але часцей не...

***— Дарэчы, а як даўно ты пішаш?***

— Вершы — яшчэ з пачатковай школы. Спачатку гэта былі дзіцячыя спробы «пад дарослага», як робяць усе ў тым узросце. Цяпер стаў крышачку разумнейшым, таму падыходжу больш сур'ёзна да гэтай справы *(усміхаецца)*.

***— Ці заўсёды задаволены вынікам?***

— Не, я як Гогаль *(смяецца)*. Насамрэч, спаліў шмат сваіх вершаў, проста кінуў іх у печку. Няўдалыя стараюся не публікаваць.

***— Што цябе натхняе на творчасць?***

— Розныя моцныя перажыванні. Напрыклад, калі ў мяне доўга дрэнны настрой, то гэта значыць, што будуць і новыя песні, і нейкія цікавыя ідэі. За апошнія месяцы я напісаў некалькі песень, якія звязаныя з канкрэтнымі людзьмі. Яны для мяне не музы, проста выклікаюць вострыя эмоцыі, якія потым кладуцца ў аснову музыкі.

***— Якое тваё жыццёвае крэда?***

— Як бы банальна ні гучала, але мой дэвіз па жыцці — дапамагаць людзям. Бо на самай справе ўсё вяртаецца. Я думаю, трэба рабіць людзям так, як хочаш, каб рабілі табе.

Мяркую, што з такой жыццёвай устаноўкай Стась абавязкова даб'ецца поспеху.

**Наталля ВАВІЛОНСКАЯ, выпускніца 11 класа ліцэя г. Наваполацка.**




# ЗДАРОЎЕ З ПАВЕТРА

**...Па суботах фізкультура ва ўніверсітэце звычайна праходзіла ў басейне. 25-метровыя дарожкі ў гэты ранішні час былі амаль цалкам у распараджэнні студэнтаў (акрамя нас, паплаваць прыходзілі яшчэ некалькі выкладчыкаў). Для тых, хто няўпэўнена адчуваў сябе на вадзе, былі пенапластавыя дошкі, для тых, хто хацеў засвоіць нешта большае, чым стыль «па-сабачаму», — трэнеры, якія не стамляліся прыдумваць новыя заданні. Ідэальна.**

Але ажыятажу не назіралася. Толькі калі займаліся першакурсніцы — для іх наведванне басейна было абавязковай умовай для заліку. Старэйшых студэнтак прыходзіла вельмі мала (хоць пару на вадзе залічвалі за дзве). Прытым што частка з іх пастаянна шукала спосабы пахудзець, самы відавочны і даступны з іх чамусьці ігнаравалі.

«Няма часу, грошай, сіл», — якія «адмазкі» вы яшчэ чулі? (Не кажу пра тых, хто спортам займацца не хоча ўвогуле.) Так апраўдваюцца дзяўчаты, якія на словах толькі і чакаюць магчымасці пабегчы ў залу. І не заўважаюць, колькі тых магчымасцяў насамрэч ёсць.

Цяпер у сталічных парках распачаліся бясплатныя заняткі ёгай. Кожную нядзелю (вядома, калі надвор'е не перашкодзіць) аматараў усходняй гімнастыкі — і прафесіяналаў, і навічкоў — запрашаюць на зялёныя пляцоўкі Мінска: у парку Перамогі, Цівалі, 40-годдзя Кастрычніка і іншых. З сабой просяць захапіць дыванок для ёгі. Так, прымусіць сябе рана прачнуцца ў выхадныя, каб ужо ў 9 гадзін быць на трэніроўцы, — тая яшчэ задачка. Але, калі спаць да абеду, вылучыць час на спорт будзе яшчэ складаней.

Бясплатныя трэніроўкі праходзяць і ў парку «Dreamland». Па суботах у 11 гадзін прапануюць выпрабаваць на сабе розныя фітнес-напрамкі. Напрыклад, у наступную суботу будзе FIZIKA. Не, школьныя задачкі рашаць не трэба. Гэта напрамак, які аб'ядноўвае ў сабе некалькі фітнес-методык і дапамагае развіваць вынослівасць і гнуткасць. Карацей, лепш адзін раз паспрабаваць, чым сто — пачуць.

Любіце бегаць, але няма кампаніі? Калі ласка! Суполка MinskRun (больш за 70 чалавек) і пяцікіламетровая дыстанцыя (у ляску!) чакаюць вас кожную суботу а 10-й гадзіне раніцы. Зноў жа бясплатна. Больш за тое, каманда валанцёраў, якая арганізуе гэтыя спартыўныя сустрэчы, прапануе яшчэ і кожны раз пасля прабежкі фіксаваць свой вынік на сайце і сачыць за прагрэсам. Дробязь, а прыемна.

Не кажу ўжо пра шматлікія акцыі ў фітнес-клубах. Толькі запісвайся.

Дзіўная рэч: усе так імкнуцца пахудзець да лета, што не заўважаюць, што лета само па сабе — цудоўная магчымасць прывесці сябе ў форму. Абставіны — спякотнае надвор'е — вымушаюць есці менш, а рухацца больш. Сяброўка нядаўна пахвалілася: нарэшце скінула злашчасныя пяць кілаграмаў. «Каб не лета, напэўна, не пратрымалася б на той дыеце. А так нават па мучным і салодкім не надта сумую: гароднiны і садавіны хапае».

Не думайце, што магчымасці прапануе толькі сталіца. Як па мне, у вёсцы ці ў невялікім горадзе ёсць усе ўмовы, каб займацца спортам. Навошта ісці ў трэнажорку, калі ёсць сапраўдны веласіпед і кіламетры сцежак уздоўж лесу ці рэчкі? А замест басейна — возера? У бабуліным двары, памятаю, нават валейбольную пляцоўку рабілі. Нацягвалі вяроўку паміж платамі двух агародаў — і давай. Галоўнае, не трапіць мячом па агурках.

Які сэнс скардзіцца сяброўкам і чарговы раз расказваць, чаму вы не можаце ўзяцца за сябе? Пахудзець гэта яшчэ нікому не дапамагала. Чым апраўдвацца (у першую чаргу перад сабой), лепш перасіліць сваю ляноту і нарэшце зрабіць штосьці з даўно складзенага плана дзеянняў. Неабавязкова адразу выпраўляцца на пяцікіламетровую дыстанцыю, каб потым тыдзень адыходзіць ад той прабежкі і з жахам думаць пра наступную. Здаровы лад жыцця пачынаецца з дробязяў, час для якіх можна знайсці кожны дзень.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
7 07 2016 г.

*Пазнаёміцца з прафесіяй*

# ЧАС ПАД МІКРАСКОПАМ,

## або Як запускаюцца механізмы

**Эпоха «разумных» гадзіннікаў надышла вокамгненна — на каляровыя дысплэі на запясцях ужо ніхто не глядзіць, як на цуд. А вось стварыць якасны аналагавы хранометр сёння, як аказалася, ці не больш складана, чым лічбавы: калі платы і мікрасхемы робіць аўтаматыка, то ўсё механічнае начынне збіраецца ўручную пад мікраскопам. Разам з намеснікам загадчыка механічнага цэха Мінскага гадзіннікавага завода Дзмітрыем МАРЦЬЯНАВЫМ мы паназіралі, як ствараюць легендарную прадукцыю маркі «Прамень», а таксама паразмаўлялі пра асаблівасці яго прафесіі.**

— Я родам з Магілёўскай вобласці, з Чавусаў, — распавядае Дзмітрый. — Пасля школы паступіў у Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт на прыборабудаўнічы факультэт. Кажучы шчыра, першай прычынай выбару месца вучобы было банальнае «куды прайду па балах». З фізікай і матэматыкай сябраваў са школы. Таму ЦТ здаваў менавіта па іх. А далей — глядзеў, дзе не самая высокая канкурэнцыя за бюджэтныя месцы. Выбраў спецыяльнасць «Бытавыя і электрабытавыя прыборы і апараты». Насамрэч, нягледзячы на такую сумнеўную матывацыю, вучыцца было вельмі цікава, выбар быў трапны. Цяпер на працы часта адчуваю, што рэчы, якія здаваліся зусім дробязнымі, на практыцы з'яўляюцца ключавымі.

**«Мне праца падабаецца за тое, што яна асаблівая. Дзе вы яшчэ ўбачыце, як на вытворчасці механізмы збіраюць пад мікраскопам?»**

На трэцім курсе вучобы хлопец вырашыў, што надышоў час пераходзіць да практыкі. Не апошнім было і грашовае пытанне. Дзмітрый пачаў самастойна шукаць вакансіі і ўпадабаў варыянт з гадзіннікавым заводам.

— Першапачаткова я працаўладкоўваўся наладчыкам такарных аўтаматаў і паўаўтаматаў, — успамінае Дзмітрый. — Пасада, пэўна, не для чалавека з вышэйшай адукацыяй, але ў мяне не было на той момант ні дыплома, ні досведу працы. Напачатку было вельмі цяжка. Калі вы ўяўляеце звычайны такарны станок, то там сістэма простая і зразумелая: бачны разцы, шпіндаль... А на нашых станках можа быць усталявана да васьмі дробных разцоў, да таго ж на так званых кулачковых механізмах — цягнеш ручку і ўсё прыходзіць у рух, прычым, на першы погляд, хатычна. Пакуль з усім разабраўся, нямала нерваў сышло.

Па словах хлопца, на Мінскім гадзіннікавым заводзе актыўна выкарыстоўваюць старую правераную стратэгію навучання маладых — замацаванне іх за старэйшымі калегамі. Так было і з Дзмітрыем — па першым часе ён працаваў з вопытным работнікам.

У абавязкі наладчыка ўваходзіць абслугоўванне станкоў, прычым адразу групы. У цэху Дзмітрый дэманструе нам адну з такіх — уздоўж сцяны расстаўлена з паўтара дзясятка станкоў, якія бесперапынна працуюць, ствараючы з латуні і іншых сплаваў дэталі: калодкі, валы, шасцерні, завадныя галоўкі. Калі ў вытворчых цэхах працуюць у асноўным мужчыны, то зборка механізмаў — пераважна жаночая праца, бо яна патрабуе высокай сканцэнтраванасці і ўседлівасці.

— Вучыцца і працаваць было цяжка, — кажа хлопец. — На завод я прыходзіў у першую змену, да сямі раніцы. Пасля бег на вучобу — да позняга вечара. Марыў аб адным — выспацца. Але пазней гэта сябе апраўдала — калі я заканчваў пяты курс, перад самым «дыпломам» на тым участку, дзе я працаваў, сышоў майстар. Кіраўніцтва прапанавала мне заняць яго месца. Я пагадзіўся, бо такая работа больш адпавядала ўніверсітэцкім ведам і спецыяльнасці.

Работа майстра кардынальна адрознівалася ад папярэдняй. На гэтай пасадзе рабіць нешта ўласнымі рукамі ўжо амаль не прыходзілася. Затое з'явілася шмат больш адказных абавязкаў: карэкціроўка працы змены, выдача персанальных заданняў супрацоўнікам. І гэта ўсё ў 22 гады!

— На дзіва, праблем са старэйшым пакаленнем у мяне не было, — кажа хлопец. — Хоць я спачатку моцна перажываў з гэтай нагоды: «Як гэта зусім малады хлопец будзе ўказваць, што рабіць дарослым мужчынам?» Але ўчастак мне дастаўся, па-першае, невялікі (усяго дзевяць падначаленых), па-другое — вельмі спакойны: ніхто не спрабаваў паставіць пад сумнеў маю кваліфікацыю ці аўтарытэт. Больш за тое — калі я нечага не ведаў, дапамагалі. Таму адаптаваўся вельмі хутка.

Але і на гэтым кар'ерны рост Дзмітрыя не скончыўся. Пераход на пасаду намесніка начальніка цэха здарыўся па тым жа сцэнарыі — вызвалілася месца, а кіраўніцтва выразіла зрабіць стаўку на маладосць. Цяпер ён кіруе ўжо ўсімі ўчасткамі свайго цэха: тэрмаапрацоўкі, гальванікі — усяго іх каля дзесяці. Разам з хлопцам мы ідзём на невялікую экскурсію па ўчастках.

— Навошта нам вырабляць так шмат дэталяў? — перапытвае Дзмітрый, калі мы назіраем дзясяткі працуючых станкоў. — Акрамя вытворчасці гадзіннікаў, частка іх ідзе да майстроў па рамонце. Элементы механізмаў падыходзяць не толькі да іншай прадукцыі пад брэндам «Прамень». Вось, напрыклад, нядаўна нам прынеслі савецкі гадзіннік іншай маркі з аўтападзаводам


Фота Надзеі БУЖАН.
У руках Дзмітрыя — адзін з дзясяткаў чарцяжоў. Той рэдкі выпадак, калі нават міліметр — завялікая велічыня для абазначэння параметраў дэталі.

(у Мінску такія ўжо даўно не выпускаюць), але ўсе патрэбныя дэталі падышлі, і ён зноў працуе. Увогуле, я лічу, што нашы хранометры вельмі добрыя. Калі б вы бачылі сістэму кантролю якасці, самі б упэўніліся. Магчыма, нам проста цяжка канкураваць з вялікімі сусветнымі і кітайскімі брэндамі.

Нягледзячы на вялікую колькасць «папяровай» работы, хлопец прыкладна палову працоўнага часу праводзіць у цэху.

— Мне праца падабаецца за тое, што яна асаблівая, — кажа ён. — Дзе вы яшчэ ўбачыце, як на вытворчасці механізмы збіраюць пад мікраскопам? У дробных дэталяў адпаведныя «допускі» — у некалькі мікронаў. Адзінае, што калі раней «Прамень» выпускаў шмат розных механізмаў, то сёння практычна ва ўсе гадзіннікі ўсталёўваецца адзін і той жа, ён называецца «Зара». Гэта ў пэўнай ступені робіць працу больш аднастайнай.


Мікраскоп — неад'емны інструмент практычна для любога супрацоўніка прадпрыемства.

**«На завод я прыходзіў у першую змену, да сямі раніцы. Пасля бег на вучобу — да позняга вечара. Марыў аб адным — выспацца».**

Па словах Дзмітрыя, моладзі на заводзе нямала, але штат пакутуе ад даволі вялікай «цякучкі» кадраў. Заробак, па сталічных мерках, тут не самы высокі, але прадпрыемства імкнецца прывабіць маладых рознага кшталту падтрымкай. Для нашага героя ёй стала выдзеленне пакоя ў інтэрнаце. Ёсць на прадпрыемстве і свой маладзёжны савет, у якім Дзмітрый займае пасаду старшыні спартыўнага сектара. Зборная «Праменя» гуляе пераважна ў футбол. На апошнім турніры з групы не выйшлі, але, па словах хлопца, «біліся годна».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Месца за стойкай*

# ФАНТАЗІІ З ШЭЙКЕРАМ

## Як «узбіць» сусветны досвед з нацыянальным каларытам

**Што мы ведаем аб прафесіі бармена, апроч даўніх стэрэатыпаў? Як імі стаповіцца і чаму? Ці можна ў бары адпрацаваць усё жыццё? Пра гэта і іншае нам расказаў супрацоўнік сталічнага «Мон Кафэ» Глеб Камароўскі.**

***— Найперш, як ты трапіў у сферу грамадскага харчавання?***

— У 2012 годзе не вельмі ўдала скончылася мая дзевяцігадовая гандбольная кар'ера і паўстала пытанне: куды ісці працаваць? Цягам года я не мог знайсці на яго адказ, пакуль нехта з сяброўкі не расказала, што ў Мінску ёсць цікавая кавярня «Мон Кафэ» і што ім патрэбны персанал. Мяне ўзялі афіцыянтам, і вось ужо чатыры гады, як я тут працую. Толькі зараз ужо барменам — я вырашыў крыху падняцца па кар'ернай лесвіцы і шукаць сябе ў творчасці, у сваіх кактэйлях. Мне падабаецца нешта прыдумваць, фантазіраваць. Я ўвесь час развіваюся, наведваю мноства семінараў.

***— Над тваёй стойкай вісіць дыплом Кіеўскай школы барменаў, адной з лепшых у Еўропе. Раскажы пра гэты свой досвед...***

— У нейкі момант я адчуў, што хачу быць сапраўдным майстрам барнай справы. Нават доўга не думаў, ехаць ці не. Так я трапіў у адну з лепшых школ для барменаў «Planeta Z». Тая адукацыя, што ў ёй даюць, каціруецца ў 69 краінах свету. Цяпер я спакойны за тое, што магу знайсці працу фактычна ў любой краіне на любым месцы.


Глеб Камароўскі за работай у кавярні.

За навучанне плацілі заснавальнікі кавярні, зрабіўшы свайго кшталту інвестыцыю ў мяне як надзейнага супрацоўніка. За гэта ім вялікі дзякуй.

***— Як праходзіў працэс навучання?***

— Гэты досвед пакінуў у маім жыцці яскравы след. Я адчуў, наколькі высока ў свеце развітая барная індустрыя. Вучыліся мы кожны дзень з ранку да вечара. Як правіла, у першай палове дня была тэорыя, а другая цалкам прысвечана практыцы. Гэта былі прафесійныя дэгустацыі з самымі знакамітымі ў свеце самелье, заняткі па прыгатаванні кактэйляў. Аднойчы знакаміты бармен Сяргей Кадацкі прыгатаваў менавіта для мяне свой фірменны кактэйль «Зялёны мексіканец».

У Беларусі барная культура яшчэ толькі пачынае развівацца, таму маёй мэтай было прывезці сюды сакумуляваныя веды, каб прымяняць іх на практыцы. Я хачу паказаць людзям тое, чаго яны яшчэ не бачылі, чаго яшчэ не каштавалі. У Кіеве я нагледзеўся розных «фішак», прывезеных настаўнікамі з Еўропы і Амерыкі. Калі спалучыць іх з беларускім каларытам, атрымаецца цікавы вынік.

***— Некаторыя, асабліва прадстаўнікі старэйшага пакалення, лічаць гэты занятак несур'ёзным...***

— Цікава, што гэты стэрэатып уласцівы толькі нам, таму што ў іншых краінах свету бармен — гэта прэстыжная прафесія. І чым больш яму гадоў, тым ён лічыцца больш вопытным і прафесійна падкаваным. Акрамя таго, быць добрым барменам — гэта быць вельмі эрудзіраваным чалавекам. Уявіце, прыходзяць самыя розныя людзі, і ім павінна быць цікава знаходзіцца ў тваёй кампаніі. Таму падтрымаць любую размову, быць заўсёды ў курсе апошніх навін і самых цікавых падзей — частка прафесіі.

***— А як бацькі паставіліся да твайго выбару?***

— Яны паважаюць тое, чым я займаюся, саму прафесію. Так, менавіта прафесію, якую я выбраў на ўсё жыццё, а не часовую падпрацоўку. Бацькі любяць прыходзіць да мяне на работу з сябрамі, каб «паказаць сына». Час ад часу на выхадных мы збіраемся разам, і я паказваю ім, што цікавага прыдумаў, чаму навучыўся ў Кіеве. А яны спецыяльна збіраюць гасцей. Я вельмі ім удзячны за такую падтрымку.

***— Якія ў цябе планы адносна прафесіі?***

— Бліжэйшым часам хачу папрацаваць на адным месцы і замацаваць тое, чаму ўжо навучыўся, даведацца пра нешта новае. Але я таксама вельмі люблю падарожнічаць. Таму ёсць такі план на бліжэйшых гадоў так з дваццаць: паездзіць па ўсім свеце, пазнаёміцца з барнай культурай розных краін. А ўжо пасля адкрыць свой невялікі сямейны бар, каб працягваць у ім прымяняць назапашаныя веды і працягваць развівацца. У гэтай справе няма мяжы дасканаласці.

**Дар'я АРЭФ'ЕВА, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# БАКСЁР З ДУШОЙ ТВОРЦЫ

**Наведваючы чарговую трэніроўку па боксе, я сустрэла ў спартыўнай зале свайго куміра Дзмітрыя Асанава. Нічога дзіўнага, бо я займаюся ў яго бацькі Сяргея Леанідавіча. Пад кіраўніцтвам апошняга маленькі сын зрабіў першыя ўдары на баксёрскім рынгу, і вось зараз 19-гадовы юнак — чэмпіён Еўропы па боксе, майстар спорту міжнароднага класа, які сёлета будзе абараняць колеры беларускага сцяга на Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра.**




— У мяне ёсць два самыя памятныя паядынкі, — прыгадвае Дзмітрый. — Вядома, самы першы. Тады хлопцы, з якімі баксіраваў, былі старэйшыя за мяне на тры гады, але я выйграў тыя спаборніцтвы і бой за алімпійскую ліцэнзію на чэмпіянаце свету. Кожная перамога вельмі значная і прыносіць вялікую радасць, таму што ты столькі зрабіў, столькі сябе абмяжоўваў, каб атрымаць вынік. Гэта вельмі прыемна.

Але кожная перамога дастаецца нялёгка.

— Шмат часу ўдзелена і рэжыму, і трэніроўкам, і харчаванню. Бо дробязяў у спорце не бывае, — тлумачыць юнак. У працэсе падрыхтоўкі да спаборніцтваў за спартсменамі строга сочыць урач-дыетолаг, падлічвае кожную калорыю. Усё адварное, нічога смажанага, мучнога, салёнага. Больш бялку, менш вугляводаў. Гэта і ёсць рэжым харчавання, які падводзіць паступова да патрэбнай вагі.

— Самае цяжкае — гэта самакантроль, — лічыць чэмпіён. — Не даваць сабе расслабляцца, таму што вялікі спорт памылак не даруе. Тым больш бокс, дзе думаць трэба хутка.

На шляху да перамогі магчымыя і траўмы. Былі выпадкі, калі Дзіму даводзілася баксіраваць з хворым плячом. Двойчы вёў бой са зламанай рукой, але, нягледзячы на гэта, перамог. А сярэбраным прызёрам Еўрапейскіх гульняў у Баку ён стаў з траўмаваным носам.

Па словах юнака, ён заўсёды памятае бацькаву параду: «Выходзь і рабі тое, што ўмееш, тое, што любіш, рабі і атрымлівай задавальненне». Спадзяюся, гэтыя словы дапамогуць спартсмену сабрацца і заваяваць свой першы алімпійскі медаль. Мы верым у цябе, Дзіма!

P.S. Вы здзівіцеся, але за моцнай і магутнай знешнасцю спартсмена хаваецца творчая натура. Аказваецца, Дзіма піша музыку і тэксты, чытае рэп і нават арганізаваў з сябрамі гурт «Лакацыя 67».

**Валерыя ЛУЖЫНСКАЯ,**
**выпускніца 8 класа**
**гімназіі-каледжа мастацтваў г. Маладзечна.**

### ПРА АЎТАРА

Валерыі, нашай чарговай аўтарцы, 14 гадоў. Не здзіўляйцеся, як і герой яе «пробы пяра», яна сумяшчае заняткі... боксам з ігрой на фартэпіяна.

— З дзяцінства мару стаць журналістам. Люблю знаёміцца з новымі людзьмі, мне вельмі падабаецца браць інтэрв'ю, — кажа пра сябе дзяўчына. Яна вельмі рада, што ў якасці суразмоўцы ёй патрапіў такі знакаміты і цікавы чалавек. «Спадзяюся, што неўзабаве мая мара здзейсніцца».

# ГІСТОРЫЯ Ў «СПАДЧЫНЕ»

**Гонар нашай школы — гісторыка-краязнаўчы музей «Спадчына», які працуе пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі Антона Антонавіча Апанасевіча. У музеі тры раздзелы: гістарычны, этнаграфічны і літаратурна-мастацкі. Гістарычны раздзел апавядае нам пра даўнюю і багатую на падзеі гісторыю Лебедзева. Тут таксама можна знайсці інфармацыю пра Першую і Другую сусветныя войны. Некалькі стэндаў і вітрын прысвечаны нашым землякам — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Наведвальнікі любяць затрымацца каля этнаграфічнага раздела, бо тут створана частка інтэр'ера сялянскай хаты мінулых часоў.**

Галоўны скарб любой мясцовасці — гэта людзі. У Лебедзеве ў свой час нарадзіліся альбо вучыліся і працавалі акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі Барыс Кіт, мастак Раман Семашкевіч, вучоны і мастак Яўген Шыраеў, гісторык Генадзь Каханоўскі, паэты Рыгор Семашкевіч, Кастусь Цыбульскі і іншыя.

Нядаўна на падставе сабраных матэрыялаў і музейнага архіва навучэнцы школы Ягор Кузін і Глеб Грымаць падрыхтавалі даследчую работу пра вучонага і мастака Яўгена Шыраева. Яе абарона адбылася ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». Юнакі сталі лаўрэатамі рэспубліканскага конкурсу «Мае землякі — мой гонар» і былі ўзнагароджаны дыпломам Міністэрства адукацыі.

На базе музея арганізаваны гурток «Музеязнаўства». Вучні праводзяць цікавыя экскурсіі. Акрамя гэтага, удзельнікі гуртка займаюцца пошукавай работай. Напярэдадні святкавання 70-годдзя Перамогі школу наведалі госці са Смаленскай вобласці. Сям'я Ягоравых шукала месца пахавання іх дзядулі — чырвонаармейца Пятра Мікітавіча Ягорава. Хутчэй за ўсё ён загінуў у 1939 годзе, калі войскі Чырвонай Арміі былі ўведзены на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Юныя краязнаўцы знайшлі інфармацыю пра тое, што на тэрыторыі Лебедзева ці ў канцы 1939-га, ці ў пачатку 1940 года на старых могілках, там, дзе цяпер устаноўлены помнік вязням Лебедзеўскага канцлагера, быў пахаваны чырвонаармеец, які памёр ад ран. Госці з Расіі ўсклалі кветкі да брацкай магілы, якую цяпер яны лічаць месцам пахавання іх дзеда.

— Выхаванне любові да беларускай мовы, да нашых нацыянальных звычаяў, свят, прывіццё павагі да нацыянальнай народнай творчасці — усё гэта з'яўляецца важным накірункам грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў дзейнасці нашага музея, — гаворыць яго загадчык Антон Антонавіч.

Мы, маладое пакаленне, адчуваем асаблівы гонар за тое, што ў нас ёсць добрыя прыклады жыцця нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў: працавітых, духоўна багатых і адукаваных людзей.

**Ангеліна ПЯТРОЎСКАЯ,**
**выпускніца 9 класа Лебедзеўскай СШ**
**Маладзечанскага раёна.**

### ПРА АЎТАРА

— Нядаўна я прыйшла ў гурток «Школа журналістыкі», каб паспрабаваць свае сілы ў гэтай нялёгкай, але, на мой погляд, цікавай справе, — расказвае Ангеліна.

Дзяўчыне 15 гадоў. Аўтарка атрымлівае асалоду ад прыроды і імкнецца захаваць яе прыгажосць на фота. Ангеліна заканчвае музычную школу па класе фартэпіяна. А яшчэ яна з дзяцінства захапляецца нумізматыкай: у яе калекцыі 304 манеты, сярод якіх ёсць і ўзоры перыяду XIX стагоддзя. А самай старадаўняй манеце — 140 гадоў.

# ВІНШУЕМ, ПЕРАМОЖЦЫ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»)*

Геаграфія аўтарскіх допісаў была прадстаўлена дастаткова шырока, але традыцыйна вылучыліся ўдзельнікі конкурсу з Мазыра і Маладзечна — і колькасна, і, галоўнае, якасна. Малайцы, так трымаць! З агульнага зноў ажно адзначым штогадовы «ціхі старт» і «імклівы фініш» чарговага творчага спаборніцтва. Гэта значыць, што ў пачатку конкурсу паступае не вельмі шмат матэрыялаў, а напрыканцы, літаральна ў апошнія дні, юныя і маладыя няштатныя аўтары нас завальваюць пасланнямі. Менавіта з гэтай прычыны (работы ж трэба прачытаць, адабраць лепшыя і падрыхтаваць іх да друку) частка матэрыялаў чамусьці так і не была надрукавана. Таму, удзельнікі (а сярод іх заўсёды ёсць і пастаянныя, хто бярэ ўдзел у творчым спаборніцтве не адзін год), калі ласка, на будучыню — дасылайце свае «пробы пяра» як мага раней.

Нягледзячы на вельмі падрабязна прапісаныя ўмовы конкурсу, рэдкая работа адпавядала ім цалкам. Гаворка нават не пра абраныя некаторымі аўтарамі тэмы, а пра розныя тэхнічныя моманты: адсутнасць кантактных звестак аўтара, нумара пашпарта ці школы, дзе вучыцца наш няштатнік, і іншае. Для атрымання гэтых звестак патрэбны быў дадатковы час і намаганні. Зрэшты, дзякуючы гэтым абставінам амаль з усімі аўтарамі, чые работы былі надрукаваны, мы размаўлялі асабіста, па магчымасці нешта ім раілі, падтрымлівалі. Думаем, у гэтым таксама ёсць станоўчы бок нашага конкурсу. (Тым не менш, калі ласка, надалей імкніцеся няўхільна прытрымлівацца заяўленых умоў творчага спаборніцтва.)

Што датычыцца памылак некаторых аўтараў з выбарам тэмы... Так, мы неадноўчы гаварылі пра тое, што планка ў нашага конкурсу дастаткова высокая. Ён разлічаны найперш на тых, хто хоча ў будучым паспытаць «журналісцкага хлеба» (гэта не перашкода для ўдзелу ў ім усіх іншых). А значыць, ужо зараз павінен праяўляць і настойлівасць, і крэатыўнасць, мець вострае вока і лёгкае пяро. Паверце, усё гэта не з'явіцца ў адзін момант само па сабе, калі вы пераступіце парог журфака. Таму і крытэрыі адбору лепшых творчых работ з нашага боку былі адпаведнымі.

На што яшчэ немагчыма не звярнуць увагу: сёлета (зрэшты, як і ў папярэднія гады за невялікім выключэннем) усе ўдзельнікі конкурсу — дзяўчаты. Зразумела, што і ў пераможцаў будуць дзявочыя імёны. За апошнія гады гэта ўжо трэці такі фінал творчага спаборніцтва (толькі аднойчы яго «разбавіў» хлопец). Вельмі рады, што дзяўчаты так жадаюць стаць журналістамі, а вось за юнакоў крыху крыўдна... Яшчэ адносна нядаўна наша прафесія лічылася больш мужчынскай, чым жаночай...

**Перамога — гэта не толькі факт публікацыі ў газеце. Нават проста ўдзел у творчым спаборніцтве, парада ад прафесійнага журналіста — вельмі карысны і патрэбны досвед для тых, хто марыць аб гэтай прафесіі.**

Напрыканцы такая немалаважная, лічым, дэталь, на якую таксама трэба звярнуць увагу і ўдзельнікам конкурсу, і іх настаўнікам і бацькам, і кіраўнікам гурткоў. Штогод у гэты час у рэдакцыю звяртаюцца абітурыенты з просьбай завізаваць ксеракопіі сваіх апублікаваных матэрыялаў. Газета для гэтага, як высветлілася, бярэцца ў школе, у гуртку, і атрымліваецца, што яна практычна не бывае ў руках абітурыентаў (інакш не трэба было б ксеракопій, у прыёмную камісію прасцей падаваць газетныя выразкі). Без інтэрнэту цяпер нікуды, але для будучага журналіста вельмі важна чытаць менавіта папяровы варыянт выдання. Асабліва таго, у якім друкуюцца твае матэрыялы. А лепшы спосаб пастаянна трымаць газету ў руках — гэта выпісаць «Звязду», каб двойчы ў месяц разам з ёй атрымліваць і маладзёжны дадатак «Чырвонку. Чырвоную змену». Не сумнявайцеся, абітурыенты, гэтая парада можа вельмі дапамагчы на вашым шляху да прафесіі.

Такім чынам, невялікі аналіз завершаны, мы выходзім на фінішную прамую! Засталося толькі назваць імёны пераможцаў чарговага конкурсу «Чырвонкі. Чырвонай змены» і павіншаваць іх з цалкам заслужаным дасягненнем. Журы аднагалосна вырашыла ўшанаваць адразу трох удзельнікаў, прызнаўшы іх пераможцамі. Гэта **выпускніца 11 класа маладзечанскай гімназіі №10 Дар'я СВІРЫДА!** Дзяўчына не першы год удзельнічае ў творчых конкурсах для юных і малады няштатных аўтараў, якія праводзіць «Чырвонка. Чырвоная змена». Толькі ў рамках сёлетняга былі змешчаны дзве «пробы пяра» Дар'і («Песні — найлепшыя лекі ад суму», «ЧЗ» ад 4.02.2016 года; «У песні, як у жыцці», «ЧЗ» ад 21.04.2016 года). Апроч таго, некалькі яе матэрыялаў друкаваліся як звычайныя журналісцкія і ў «рэдакцыйным партфелі» яшчэ маецца іх запас ад гэтага актыўнага аўтара. Дар'я сёлета збіраецца паступаць у Інстытут журналістыкі БДУ. Па сакрэце скажам, што да гэтай падзеі яна падышла з сур'ёзным творчым багажом — гатова прад'явіць экзаменацыйнай камісіі партфоліа з 19 сваіх работ. Вось гэта заяўка!

Наступная пераможца — **выпускніца 10 класа Ліцэя БДУ Настасся ГАРОСТ** («Падабаецца дапамагаць іншым», «ЧЗ» ад 4.02.2016 года). Дзяўчына не выключае, што ў будучыні можа звязаць свой далейшы лёс з прафесіяй журналіста. У Настассі ёсць яшчэ час падумаць, але сваёй творчай работай і заслужанай перамогай у конкурсе яна ўжо, на наш погляд, пацвердзіла правільнасць памкненняў.

Яшчэ адно імя з ліку пераможцаў — **выпускніца 9 класа пінскай СШ №15 Дар'я БАХІР** («Адпраўная кропка. Стваральнік і дырэктар музея — дзевяцікласнік», «ЧЗ» ад 21.04.2016 года). Аўтарцы 15 гадоў, але яна таксама, як і іншыя пераможцы, марыць аб паступленні ў Інстытут журналістыкі БДУ. А для гэтага ўжо зараз актыўна піша артыкулы ў газеты, сустракаецца і размаўляе з цікавымі людзьмі. Словам, робіць усё тое, што выконвае ў паўсядзённай працы прафесіянал. Перамога ў конкурсе гаворыць пра тое, што ў дзяўчыны — пры далейшай карпатлівай працы над сабой — ёсць усе шанцы праз некаторы час стаць нашым калегам «па цэху».

Віншуем усіх пераможцаў і ўдзельнікаў! Гаварылі раней і працягваем сцвярджаць: тых, хто прайграў, у нашым конкурсе не бывае! Перамога — гэта не толькі факт публікацыі ў газеце. Нават проста ўдзел у творчым спаборніцтве, парада ад прафесійнага журналіста — вельмі карысны і патрэбны досвед для тых, хто марыць аб гэтай прафесіі.



Фота Надзеі БУЖАН.

Абедзве Дар'і і Настасся атрымліваюць ад «Выдавецкага дома «Звязда» ганаровыя граматы, а таксама памятныя прызы з сімволікай старэйшай беларускай штодзённай грамадска-палітычнай газеты, якая ў наступным годзе будзе адзначаць свой 100-гадовы юбілей. Дар'я Свірыда, апроч таго, атрымлівае ад рэдакцыі рэкамендацыю для паступлення ў Інстытут журналістыкі БДУ, паколькі, як самая старэйшая сярод дзяўчат-пераможцаў, ужо сёлета збіраецца паступаць. (Нагадаем, РЭКАМЕНДАЦЫЯ ДАЕЦЦА ТОЛЬКІ ПЕРАМОЖЦАМ І ЛАЎРЭАТАМ КОНКУРСУ З ЛІКУ ВЫПУСКНІКОЎ, ЯКІЯ Ў ГЭТЫМ ЖА ГОДЗЕ ПАСТУПАЮЦЬ НА ЖУРФАК, І ТОЛЬКІ Ў ГОД ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ.) Удачы! Усім творчых поспехаў! І... чакаем новых матэрыялаў!

**Куратары праекта**
**Надзея НІКАЛАЕВА, Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Извещение о проведении аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| | | |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)** | |
| | **ЛОТ №1*** | |
| | в квартале, ограниченном ул. Московской, ул. Богданчука, ул. Васнецова, на земельном участке площадью 3,0380 га с объектами недвижимости, подлежащими сносу | |
| **Функциональное назначение земельного участка** | строительство многоквартирных жилых домов повышенной комфортности в квартале «Тришин». Жилые дома №1 и №2 со встроенными помещениями торгово-общественного питания | |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **в аренду сроком 5 лет** | |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | Жилые дома, сооружения и многолетние насаждения граждан по ул. Московская, 235, 239, 241, 243, ул. Крушинская, 4, 6, 8, 10, 12, 14, 16, 18 и объект недвижимости ТУП «Брестский рынок» по ул. Богданчука, 1 | |
| Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке | | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | | **406 323,44** |
| **Сумма задатка (руб.)** | | 81 265 |
| **Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)** | | 11 689,54 |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям (руб.)** | | **605 702,60** *(на 29.06.2016 г.)* |
| **ОРГАНИЗАТОР ТОРГОВ – КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»** | | |

**Условия продажи:**

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;

- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий двух лет, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;

- строительство многоквартирных жилых домов будет осуществляться за счет собственных средств, без привлечения денежных средств дольщиков, без заключения договоров создания объектов долевого строительства, а также без заключения между застройщиком-эмитентом жилищных облигаций и иным лицом договоров (соглашений), предусматривающих обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций в установленном законодательством порядке;

- при проектировании и строительстве многоквартирных жилых домов будет учтен регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом, а именно осуществить строительство двух многоквартирных жилых домов с возведением монолитного стилобата и использованием конструкций их железобетонных изделий по серии 90М БР производства КУП «Брестжилстрой». В одном из домов предусмотреть строительство 14-этажной монолитной вставки;

- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;

- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке) победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке градостроительного паспорта, земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта;

- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан приступить к освоению (занятию) земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство объекта).

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом –** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

В случае признания участника победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона, выразившим согласие на предоставление ему предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, данное лицо обязано в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов **возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.**

**Аукцион состоится 11 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 07.07.2016 г. до 17.30 05.08.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.)**
**по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Изолированное помещение, инв. № 422/D-39549 (назначение – торговое помещение, наименование – магазин), площадью 371,0 кв.м, расположенное по адресу: а.г. Василишки, ул. Советская, 17А-2 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425881301602000518, площадью 0,2161 га (назначение – для обслуживания здания магазина) по адресу а.г. Василишки, ул. Советская, 17А |
| **Начальная цена продажи** | 60 000 р. (шестьдесят тысяч) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3000 р. (три тысячи) |
| **Продавец** | Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739 УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 29 июля 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 03.02.2016 г.**

**Последний день приема заявлений на участие в аукционе – 25 июля 2016 г.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,**
**с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

# Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже имущества. Торги проводятся в форме открытого аукциона. Торги состоятся 9 августа в 11.00 по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38

| №лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (цена с учетом НДС) | Задаток руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Станок для нанесения ПВХ на перчатки, инв. № 1058 | 1 101,00 | 11,01 | 5 | 66,74 |
| Лот №2 | Спецоверлок в комплекте, инв. №1057 | 154,92 | 15,49 | 5 | 66,74 |
| Лот №3 | Спецоверлок в комплекте, инв. №1055 | 154,92 | 15,49 | 5 | 66,74 |
| Лот №4 | Спецоверлок в комплекте, инв. №1056 | 154,92 | 15,49 | 5 | 66,74 |
| Лот №5 | Пухообдуватель АОСП-6, инв. №973 | 88,68 | 8,87 | 5 | 66,74 |
| Лот №6 | Прядильно-крутильная машина ПК-100 М4ноябрь 2004, инв. №979 | 1 096,56 | 109,66 | 5 | 66,74 |
| Лот №7 | Промышленная швейная машина, инв. №73 | 430,68 | 43,07 | 5 | 66,74 |
| Лот №8 | Промышленная швейная машина, инв. №72 | 430,68 | 43,07 | 5 | 66,74 |
| Лот №9 | Машина для вязания перчаток, инв. №1054 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №10 | Машина для вязания перчаток, инв. №1053 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №11 | Машина для вязания перчаток, инв. №1052 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №12 | Машина для вязания перчаток, инв. №1051 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №13 | Машина для вязания перчаток, инв. №1049 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №14 | Машина для вязания перчаток, инв. №1048 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №45 | Машина для вязания перчаток, инв. №1047 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №16 | Машина для вязания перчаток, инв. №1045 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №17 | Машина для вязания перчаток, инв. №1044 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №18 | Машина для вязания перчаток, инв. №1043 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №19 | Машина для вязания перчаток инв. №1042 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №20 | Машина для вязания перчаток, инв. №1020 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №21 | Машина для вязания перчаток, инв. №1022 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №22 | Машина для вязания перчаток, инв. №1025 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №23 | Машина для вязания перчаток, инв. №1026 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №24 | Машина для вязания перчаток, инв. №1041 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №25 | Машина для вязания перчаток, инв. №1040 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №26 | Машина для вязания перчаток, инв. №1039 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №27 | Машина для вязания перчаток, инв. №1038 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №28 | Машина для вязания перчаток, инв. №1037 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №29 | Машина для вязания перчаток, инв. №1036 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №30 | Машина для вязания перчаток, инв. №1035 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №31 | Машина для вязания перчаток, инв. №1027 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №32 | Машина для вязания перчаток, инв. №1034 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №33 | Машина для вязания перчаток инв. №1028 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №34 | Машина для вязания перчаток инв. №1029 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №35 | Машина для вязания перчаток инв. №1030 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №36 | Машина для вязания перчаток, инв. №1033 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №37 | Машина для вязания перчаток, инв. №1032 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |
| Лот №38 | Машина для вязания перчаток, инв. №1038 | 810,24 | 81,02 | 5 | 66,74 |

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (цена с учетом НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №39 | Электроуправление UNIcontrol, инв. №1189; чесальная машина С60, инв. №1177; чесальная машина С60, инв. №1178; чесальная машина С60, инв. №1180; чесальная машина С60, инв. №1179; фильтровальная установка для кольцепрядильных и мотальных машин, инв. №3021; фильтровальная установка DPZ PP-100, инв. №1187; тонкий очиститель В 51S, инв. №1183; тонкий очиститель В 51S, инв. №1184; тонкий очиститель UNIflex В60, инв. №1170; съемное устройство для верхних валиков, инв. №53; смеситель UNImix В71, инв. №1169; система пневматического транспорта волокон, инв. №1188; ровничная машина F15 с пухообдувателем «Luwa», инв. №2009; ровничная машина F15 с пухообдувателем «Luwa», инв. №1199; пневмомеханическая прядильная машина Autocoro 480/360, инв. №1165; питатель-смеситель В34R, инв. №1185; питатель-смеситель В34S, инв. №1181; крестомотальный аппарат Автоканер, инв. №3024; конденсор А21, инв. №1172; конденсор А21, инв. №1173; конденсор А21, инв. №1174; кольцепрядильная машина Zinser 351/1200, инв. №3022; кольцепрядильная машина Zinser 351 С/1680, инв. №3023; кипоразрыхлитель UNIflok А11, инв. №1166; дозатор UNIblend А81, инв. №1186; детектор инородных волокон VISION SHILD Direct MPIX, инв. №1171; грубый очиститель UNIclean В12, инв. №1168; грубый очиститель UNIclean В12, инв. №1167; бункер-питатель UNIstore А78, инв. №1175; бункер-питатель UNIstore А78, инв. №1176;ленточная машина SB D-40, инв. №1190; ленточная машина SB D-40, инв. №1191; ленточная машина RSB D-40, инв. №1193; ленточная машина RSB D-40, инв. №1192; лабораторные приборы Равнометр КЕТ-80 V/B, инв. №1194; лабораторные приборы WIRA (CCS-KMA станция), инв. №1195; лабораторные приборы FM-30 непс и трэш тестер, инв. №1196 | 3 635 039,64 | 36 350,40 | 5 | 2 688,29 |

**Имущество расположено по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38.**

Для участия в торгах необходимо:

1. *Оплатить задаток в размере указанном в объявлении от начальной цены лота на р/с 3012210290015 в РКЦ №8 филиала ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление г. Ветка, ул. Чапаева, 6, МФО 151501912, УНН 400052674.*

2. **По 5 августа 2016 года** включительно в рабочие дни с 8.00 до 15.00 подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл., г. Ветка, ул. Батракова, 38.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо предоставляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный и обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начало торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроков их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Порядок проведения торгов, условия, оформление участия в торгах определяются согласно Плану ликвидации ОАО «Ветковская хлопкопрядильная фабрика», ознакомиться с которым можно в дни приема заявок на участие в торгах. С дополнительной информацией о торгах можно ознакомиться по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38, тел.: 8(02330) 2-11-06, 2-12-03.

Парады бывалых

# НАСУСТРАЧ ПРЫГОДАМ, або Аўтастопам па ўсім свеце

**Экскурсійны аўтобус, распланаваны маршрут, камфортны гатэль, «прабежка» ад адной славутасці да другой, каб пабачыць хоць адным вокам і, вядома ж, сфатаграфаваць як мага больш — тыповае падарожжа.... А можа, проста ўзяць заплечнік, прыкладна «накідаць» маршрут, знайсці такога ж рызыкоўнага сябра і — прывітанне, прыгоды?! Для тых, хто выбраў альбо яшчэ выбірае другі варыянт, Эмілія, Багдан і Вольга раскажуць сваю гісторыю падарожжа аўтастопам.**

**Эмілія КОМАР, выпускніца факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Янкі Купалы:**




— Так я пачала ездзіць яшчэ школьніцай, начытаўшыся прыгодніцкай літаратуры. Але ўсе падарожжы былі ў межах Беларусі. Гэтым жа летам з сяброўкай вырашылі вырвацца далей — у Еўропу. Наш маршрут ляжаў праз Літву, Польшчу, Чэхію, Аўстрыю, Германію, Францыю, Швейцарыю, Італію, Славенію, Венгрыю і Славакію — 6210 кіламетраў. І гэта было неверагодна! Да падарожжа мы ніяк не рыхтаваліся: проста вырашылі, што паедзем. Маршрут прыкладны быў, карэкціравалі яго ўжо падчас падарожжа. Начавалі ў каўчсёрфераў — людзей, зарэгістраваных на спецыяльным сайце, гатовых прыняць падарожнікаў бясплатна. У Швейцарыі нас два разы «ўзяла» паліцыя за аўтастоп у неналежным месцы — у іх усё строга. Але, на шчасце, паліцэйскія былі дастаткова лагодныя і не выпісалі нам штрафу. У Венецыі мы не змаглі знайсці начлег і засталіся б на вуліцы, каб не пазнаёміліся з мілым акцёрам тэатра, які дапамог нам, прапанаваўшы дах над галавой. Мне здаецца, удача заўсёды была з намі, бо кіроўцы траплялiся прыветлівыя і цікавыя. Яны падвозілі, нават калі ім было не па дарозе, кармілі, частавалі рознымі ласункамі — гэта ўразіла. Ну і, безумоўна, тыя мясціны, якія нам давялося пабачыць — непаўторна прыгожыя, часта нязвыклыя беларускаму воку. Шкада, што мы былі абмежаваныя ў часе — дома чакалі справы, і мы мусілі вярнуцца да канкрэтнага тэрміну. А ўвогуле класна, калі ты проста едзеш, ні пра што не думаеш і застаешся ў адным горадзе столькі, колькі пажадаеш. Ведаючы, што свет такі неверагодны, разумею, што ніколі не змагу сядзець на адным месцы!

**Багдан ПАЧАПСКІ, выпускнік геаграфічнага факультэта БДУ:**



— Асабіста мой досвед вандровак аўтастопам пачаўся не вельмі даўно — два гады таму. Да гэтага былі толькі невялікія паездкі па Беларусі. А тады неяк з сябрамі спантанна вырашылі наведаць Санкт-Пецярбург. Часу было мала, таму ехаць вырашылі аўтастопам. Магчыма, гэта была паездка менавіта дзеля такіх прыгод, а не каб паглядзець Піцер. Усё прайшло гладка — мы проста пагулялі адну ноч у горадзе, а раніцай ірванулі дамоў. У далейшым карыстацца аўтастопам прыходзілася вельмі шмат: падарожнічаў па Украіне, Расіі, Малдове і, зразумела, Беларусі. Аднак гэта былі ўжо вандроўкі, у якіх аўтастоп быў проста спосабам перамяшчэння.

Сёлета вырашыў, што па рускамоўных краінах вандраваць надакучыла. З братам набылі танныя квіткі на самалёт і паляцелі ў Турцыю. Правёўшы ў дарагім Стамбуле некалькі дзён, адправіліся аўтастопам па Паўночнай Турцыі ў Грузію. 1300 кіламетраў адолелі менш чым за двое сутак, начуючы ў палатках на кемпінг-стаянках. Асноўнай праблемай быў моўны бар'ер — у Турцыі амаль ніхто не ведае англійскай мовы. Прыходзілася карыстацца размоўнікам, здаралася, што гэта прыводзіла да некаторых нечаканых сітуацый. Тады ж нам давялося «пааўтастопіць» па Грузіі і Арменіі. Ва ўсіх гэтых краінах такі спосаб перамяшчэння проста шыкоўны — больш за 15 хвілін нам даводзілася стаяць толькі адзін раз.

> **«Наш маршрут ляжаў праз Літву, Польшчу, Чэхію, Аўстрыю, Германію, Францыю, Швейцарыю, Італію, Славенію, Венгрыю і Славакію — 6210 кіламетраў».**

Прыгоды і цяжкасці, што чакаюць чалавека, які рызыкнуў паспрабаваць і выйшаў на шашу, — незабыўны досвед. Падарожнічаць аўтастопам не страшна, як думае большасць. Галоўнае — быць адкрытым з кіроўцамі і ўсміхацца.

**Вольга ТРУБАЧ, працуе педагогам дадатковай адукацыі ў дзіцячым цэнтры ранняга развіцця ў Маладзечне:**

— Аднойчы ўбачыла відэа пра Ісландыю — востраў вулканічнага паходжання. Удумайцеся толькі: людзі жывуць на вулкане, ды яшчэ акружаны спячымі вулканамі з усіх бакоў! Вялікая колькасць вадаспадаў, гейзераў, ледавікоў. Гэтая непаўторная прыгажосць і адначасова небяспечнасць зачаравалі мяне. Яшчэ некалькі артыкулаў — і я ведала, што траплю ў краіну вікінгаў. Знайшла чалавека, які арганізоўвае туды паходы, дамовілася. Здаецца, сядзі і чакай! Не! Нейкая сіла падняла мяне, і я адмовілася ад групавога паходу. Хутка знайшлася напарніца, сяброўка Маша, якая ўжо чатыры гады марыла пра такое падарожжа.

Аўтастоп у Ісландыі «працуе» вельмі добра. Першая машына спынілася пасля трох кіламетраў няспешнага шпацыру ад аэрапорту. Хто толькі нас не падвозіў: ісландцы, тайландка, французы... Каб не гэтыя кіроўцы, нават не ведаю, што б я магла ўбачыць. Ісландыя вельмі дарагая краіна. У аэрапорце набылі кемпінг-карту, якая дазваляла начаваць у 42 кемпінгах. Цікава, што яе амаль нідзе не правяралі. Ісландцы вераць у добрасумленнасць чалавека.

«Як я там буду без добрага валодання англійскай мовай», — непакоілася я. Мінімальны запас слоў, мова жэстаў — і вы ў патрэбным месцы. Аднак падтрымліваць камунікацыю хочацца, таму ўжо вучу англійскую мову.


Вольга Трубач (злева).

Сказаць, што мяне здзівіла ісландскае надвор'е — нічога не сказаць. Яно вельмі хутка мяняецца: вось я ў майцы, а праз 15 хвілін на мне ўжо цёплая вопратка і дажджавік. У Ісландыі ёсць прымаўка: «Вам не падабаецца гэта надвор'е? Пачакайце пяць хвілін, і яно будзе яшчэ горш!»

Калі вы захочаце адчуць усё гэта на сабе, то наперад! Толькі адна парада: не спрабуйце эканоміць грошы на абутку. А яшчэ ўсім, хто падарожнічае аўтастопам, раю Maps.Me — афлайнавую праграму дэталёвых карт краін усяго свету. Яна дазваляе адсочваць тваё месцазнаходжанне, падлічваць кіламетры, пракладваць маршрут і г.д.

...Да гэтага і я падарожнічала звычайна. Ды пасля такіх прыгодніцкіх аповедаў захацелася, каб з'явілася гісторыя і майго падарожжа аўтастопам... Ужо пампую карту і набываю добры абутак!

**Юлія БУКЕЛЬ.**

Рамантыка з узбочыны

# НОЧ У КАРОЎНІКУ

## Падарожнікі пра спосаб «злавіць экстрым»


Што там, за гарызонтам?

**«Аўтастопшчыкі» — гэта экстрэмалы і энтузіясты з асаблівым ладам жыцця, які даспадобы не кожнаму. Студэнты факультэта журналістыкі БДУ — трэцякурсніца Вікторыя Шахрай і першакурснік Мікалай Заяц — падзяліліся ўласным вопытам вандравання такім спосабам.**

***— Што вас падштурхнула да такога захаплення?***

**В:** — Усё пачалося са знаёмства з маладым чалавекам, які пазней стаў маім хлопцам. Два гады таму мы спазніліся на электрычку ў Маладзечне, і прыйшлося ехаць у Мінск аўтастопам. Я хвалявалася, а ён супакойваў: у Сержа быў вялікі вопыт гэткіх вандровак. Пасля таго выпадку зразумела, што аўтастоп — даволі вясёлы спосаб баўлення часу.

**М:** — Мой старэйшы брат калісьці такім чынам дабраўся да Амстэрдама. Я тады быў малы, але мяне гэта вельмі ўразіла. Потым, калі сам пачаў падарожнічаць, вырашыў паспрабаваць і аўтастоп. Сёння ніколечкі не шкадую і часта выкарыстоўваю такі спосаб перамяшчэння. На мой погляд, ён найбольш цікавы сярод усіх вядомых.

***— Які маршрут быў найбольш запамінальным?***

**В:** — Мінулым летам мы задаліся мэтай паглядзець Палессе. Пешшу і аўтастопам апісалі своеасаблівы трохкутнік: Мінск — Кобрын — Драгічын — Пінск — Лагішын — Мінск. Незвычайным здаліся рачны порт і вакзал у Пінску. У Лагішыне давялося пабачыць велічны каталіцкі касцёл, каля якога процьма падлеткаў гуляла ў футбол. Яшчэ я зразумела, што дзіўная палеская гаворка — не прыдумка Мележа. Не менш уразіла паездка ў Быхаў праз Магілёў. На вакзале ў апошнім мы сустрэлі «металіста», які прапанаваў пераначаваць у інтэрнаце. Хлопец аказаўся надзвычай гасцінным: паслаў нам на ложку, сам спаў на падлозе, накарміў сняданкам, зладзіў экскурсію па школе рока і панка.

**М:** — Найбольш спадабалася апошняе падарожжа. Мы з сяброўкай ездзілі ў вёску Селішча ў кірунку Вушачаў. Даўно хацелася паглядзець на мясцовую славутасць — руіны касцёла Святой Веранікі. Аўтастоп атрымаўся плённым, бо нас падбіралі нават на ціхіх трасах. Каля Лепеля падхапілі два хлопцы — Паша і Максім. Калісьці яны таксама былі «аўтастопшчыкамі». Яны ехалі на працу ў Полацк, але вырашылі наведаць Селішча разам з намі. Пасля мы яшчэ прыпыніліся на месцах баявой славы. Падтрымліваю стасункі з Пашам і Максімам дагэтуль.

***— Якія перавагі і недахопы ў такіх падарожжаў?***

**В:** — Галоўны мінус — поўны выхад з зоны камфорту. За плячыма — трыццаць кілаграмаў, ты ў пастаянным руху, таму хутка стамляешся. Прыходзіцца мірыцца з адсутнасцю бытавых умоў, часта нават рукі вымыць няма дзе. Але ўсе недахопы перакрэсліваюцца неабмежаванай свабодай, магчымасцю ўбачыць не адмыслова прыгладжаны для турыстаў, а сапраўдны горад. Гэта выдатны спосаб «злавіць экстрым».

**М:** — Аўтастоп дае магчымасць пазнаёміцца з новымі людзьмі. Калі-ні-калі нават знаходзіш карысных для сябе кантакты. Гэта выдатны спосаб даследаваць родную краіну з мінімумам грашовых сродкаў. Але, напэўна, найменш надзейны від перамяшчэння: машыну можна злавіць за дваццаць хвілін, а можна стаяць з паднятай рукой восем гадзін на ўзбочыне і застацца начаваць у не самых зручных месцах. Але ўсё гэта кампенсуецца незабыўнымі ўражаннямі.


Сябры па аўтастопу.

***— Чым адрозніваюцца людзі ў розных рэгіёнах?***

**В:** — Больш за ўсё ўразіў гоман і грукат у сельскім аўтобусе па дарозе ў Быхаў: куры кудахчуць, кацяняты мяўкаюць, бабулькі абмяркоўваюць, дзе яйкі падаражэлі, а тварог патаннеў... У Заходняй Беларусі такога не сустрэнеш, бо людзі тут замкнутыя.

> **«Машыну можна злавіць за дваццаць хвілін, а можна стаяць з паднятай рукой восем гадзін на ўзбочыне і застацца начаваць у не самых зручных месцах».**

**М:** — Не толькі ў кожнай вобласці, але і ў кожным раёне свае гаворкі, асаблівасці вымаўлення і значэнні слоў. Палешукі, перш чым пачнуць гаварыць, памаўчаць, добра падумаюць. Яны людзі не балбатлівыя, паважныя, стрыманыя. На ўсходзе краіны, наадварот, больш адкрытыя, з душою нараспашку.

***— Без якіх рэчаў не абысціся ў дарозе?***

**В:** — Неабходна ўзяць цёплае адзенне, зменны мяккі абутак і тэрмас з гарбатай. Калі падарожжа доўгае, то патрэбна палатка. Пажадана захапіць бутэрброды, бо дакладна не ведаеш, калі і дзе знойдзеш прыстанак. Можна ўкінуць у заплечнік некалькі яблыкаў у якасці зубной шчоткі.

**М:** — Не трэба забывацца пра грошы і дакументы. Заўсёды неабходна аптэчка з бінтам, перакісам вадароду, лекамі ад болю ў жываце і галаве. Ліхтарык, запалкі, дыванок і сцізорык таксама патрэбныя рэчы. Я заўсёды з сабой бяру надзіманую падушку.

***— Вашы самыя яркія ўражанні?***

**В:** — Аднойчы давялося заначаваць у кароўніку. Ноч заспела нас у полі, а ўдалечыні зззялі агеньчыкі фермы. Кароўнік аказаўся надзвычай чысценькім, а рагатыя пастаяльцы пахлі сырадоем. Мы закапаліся ў сена і заснулі.

**М:** — Неяк на паўднёвым заходзе краіны мы з сябрамі вырашылі жартам спыніць конны воз, на якім, не спяшаючыся, ехаў дзядуля. Поўнай нечаканасцю была дапамога з яго боку: ён падвёз нас кіламетраў дзесяць.

***— Якія планы на будучыню?***

**В:** — Хачу праехацца па месцах з закінутымі культавымі пабудовамі (Ружаны, Крэва, Карэлічы). Планую падарожжа па месцах баявой славы Першай сусветнай вайны.

**М:** — Было бы цікава паспрабаваць іншыя віды «вольных падарожжаў». Напрыклад, гідрастоп на грузавых суднах, авіястоп і на цягніках, як правіла, грузавых.

**Вераніка УЛАСЕВІЧ, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
7 07 2016 г.

# МЯЧ ПАД СОНЦАМ

## Як дзве нашы Вікторыі заваёўваюць пляжы свету

**На чэмпіянаце Еўропы (U-20), які завяршыўся нядаўна ў Турцыі, беларускі дуэт — Вікторыя Сакрэтава і Вікторыя Шалаеўская — заваявалі першыя для беларускага жаночага пляжнага валейбола ўзнагароды. Гэта стала добрай нагодай пазнаёміцца з летнім відам спорту бліжэй. Трэнер нашых дзяўчат Сяргей ДАНІЛАЎ расказаў пра шлях да доўгачаканых медалёў, спецыфіку пляжнага валейбола і пра тое, калі беларускія пляжнікі заявяць пра сябе на Алімпіядзе.**

Пляжны валейбол, або, як яго яшчэ называюць, «біч-волей», з простай забавы паступова перарос у алімпійскі від спорту і ў 1996 годзе дэбютаваў у Атланце. Поспех на Алімпіядзе перасягнуў усе чаканні — турнір па пляжным валейболе стаў адным з самых наведвальных. І дэбютант з першай спробы заваяваў тытул аднаго з самых папулярных алімпійскіх відаў спорту.



Сяргей Віктаравіч са сваімі падапечнымі.

У Беларусі ён пачаў развівацца з пачатку 90-х, і гэта насіла толькі аматарскі характар. Прафесійныя каманды з'явіліся ўжо бліжэй да двухтысячных, тады пляжны валейбол Беларусі прадстаўлялі толькі мужчыны.

*— Да 2011 года жаночага пляжнага валейбола ў нас не было ўвогуле,* — гаварыць Сяргей Віктаравіч, трэнер «бронзавага» дуэта. *— Штуршок быў дадзены мінулым кіраўніцтвам Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Бо гэта алімпійскі від спорту, на Гульні можна заявіць 4 каманды ад краіны (па дзве мужчынскія і дзве жаночыя), а гэта 4 патэнцыйныя медалі. Напрыклад, амерыканкі на мінулай Алімпіядзе выйгралі «золата» і «серабро», паклаўшы ў скарбонку сваёй краіны адразу дзве ўзнагароды ў адным відзе спорту.*

У нашай краіне было вырашана зрабіць упор на маладых гульцоў. З трох пар трэнер адабраў дзвюх дзяўчын, дзвюх Вікторый — Сакрэтаву і Шалаеўскую.

*— Яны прыйшлі з класічнага валейбола, але на той момант былі вельмі маладзенькімі, «сыры» матэрыял, з якога яшчэ можна было нешта ляпіць,* — распавядае настаўнік.

Каб трапляць на самыя прэстыжныя турніры па пляжным валейболе, а гэта Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету і Еўропы, трэба на працягу сезона набіраць рэйтынгавыя ачкі. Пачатковы шлях для нашага дуэта быў вельмі цяжкім, бо калі яны прыязджалі на адборачныя турніры з нулявым рэйтынгам, траплялі на моцныя каманды і доўгі час проста не маглі пераадолець кваліфікацыю.

*— У 2014 годзе ў нас быў першы прарыў — 7-е месца з 32-х камандаў на чэмпіянаце Еўропы (U-18). Гэта было першым званочкам, што дзяўчаты цікавыя і перспектыўныя.*

Яшчэ праз год Сакрэтава і Шалаеўская сталі 4-мі на кантыненце, прадставілі Беларусь на Еўрапейскіх гульнях у Баку і ў 2016-м ужо з добрым багажом спартыўных ведаў і вопыту заваявалі бронзавыя ўзнагароды чэмпіянату Еўропы.

*— У нас была вельмі моцная група — Расія, Італія, Беларусь і Данія. Тры каманды з квартэта апынуліся ў першай чацвёрцы кантынентальнага чэмпіянату. Вельмі цяжкай была першая гульня плэй-оф з Турцыяй. Я і сёння не магу зразумець, як мы яе выцягнулі. Спякота — 40 градусаў у цені, турчанкі больш прывыклі да такога надвор'я, таму адчувалі сябе лепш за нашых і далі беларускам сапраўдны бой. Але ў нашай каманды байцоўскі характар, у дзяўчат моцны стрыжань унутры, велізарная сіла волі,* — дзеліцца Сяргей Віктаравіч.

У паўфінале беларускі дуэт трапіў на леташніх чэмпіёнак Еўропы — зборную Галандыі — і ва ўпартай барацьбе прайграў сапернiцам, заняўшы трэцяе месца на турніры.

Наогул, лідзіруючыя пазіцыі ў сучасным жаночым пляжным валейболе за бразільскімі і амерыканскімі дзяўчатамі.

Што тычыцца перспектыў нашых маладых спартсменак, то і трэнер, і спартыўнае кіраўніцтва ўпэўнены, што яшчэ больш гучныя перамогі беларусак не за гарамі. Адбор на Алімпійскія гульні пачынаецца за два гады, і нашы дзяўчаты гатовыя змагацца.

*— Цяпер перад маімі падапечнымі стаяць канкрэтныя задачы — трапіць на Алімпіяду-2020. Яны гэта разумеюць, і я бачу ў іх велізарнае жаданне. Пляжны валейбол — вельмі цяжкі від спорту, ён патрабуе не толькі сур'ёзнай фізічнай падрыхтоўкі, але і пэўных маральна-валявых якасцяў. Маладыя павінны набірацца вопыту, таму да наступнай Алімпіяды Вікторыі якраз павінны падысці падрыхтаванымі,* — лічыць настаўнік.

Самым галоўным адрозненнем пляжнага валейбола ад класічнага з'яўляецца тое, што на пяску гуляюць два на два, хоць памер пляцоўкі меншы ўсяго на метр. У пляжным валейболе немагчымы замены.

*— Калі ў «класіцы» ў аднаго спартсмена гульня не пайшла, заўсёды ёсць магчымасць замяніць яго на іншага, а тут правяраецца моц духу. Ты павінен сабрацца, хутка знайсці сваю гульню і застаецца на корце ў любой сітуацыі. У «класіцы» трэнер можа ўзяць перапынак, каб штосьці падказаць сваім падапечным, прывесці ў пачуцці; пляжнікі ж самі выкараскваюцца са складаных сітуацый. Акрамя таго, у нас зусім іншая дынаміка, у гульні пляжнікаў больш хітрасці, тактыкі, у класіцы ўсё ж такі вынік больш залежыць ад хуткасці,* — расказвае спецыяліст.

Усе гульні праходзяць пад адкрытым небам, але асаблівых абмежаванняў, як ні дзіўна, практычна няма. Спякота ў 37-40 градусаў зусім не з'яўляецца падставай для адмены або спынення гульні.

*— Бываюць сітуацыі, калі ад спёкі гульцы ў прамым сэнсе губляюць прасторавую арыентацыю, блытаюць, у якім баку сетка. Але не толькі ў сонцапёк гуляць складана, надвор'е ж можа мяняцца ўмомант, асабліва каля мора. Напрыклад, калі ідзе праліўны дождж, таксама валейбалістам няпроста, практычна немагчыма выканаць падачу. Гульня спыняецца — толькі калі б'юць маланкі.*

Сяргей Віктаравіч адзначае, што міжнародная федэрацыя сочыць і ўхваляе тое, якімі тэмпамі развіваецца пляжны валейбол у Беларусі. У 2013 годзе ўпершыню краіне даверылі правядзенне буйнога міжнароднага турніру ў гэтым відзе спорту — маладзёжнага чэмпіянату Еўропы (U-18). Спецыяльна для яго ў Маладзечне быў пабудаваны цудоўны стадыён для пляжных відаў спорту. Спаборніцтвы выклікалі вялікую цікавасць гледачоў, падчас турніру былі запоўнены не толькі трыбуны, але і ўся прастора каля стадыёна.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# «Без музыкі ўжо нікуды»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)




***— Рашэнне падаваць заяўку для ўдзелу ў дзіцячым конкурсе «Віцебск-2016» было сямейным?***

**Глеб:** — Так, рашэнне не было спантанным. Мы разумеем, што спевы — гэта Насціна прафесія ў будучыні. Мы маем пэўны план развіцця на год і стараемся яго выконваць. Свет эстрады развіваецца вельмі хутка, таму ўжо сёння нельга губляць ні хвіліны. Цяпер сястра ў такім узросце, калі варта ездзіць на конкурсы, таму стараемся максімальна выкарыстоўваць усе магчымасці. І прадстаўленне Беларусі на дзіцячым конкурсе «Віцебск-2016» было рашэннем, да якога мы мэтанакіравана ішлі і доўга рыхтаваліся.

***— Значыць, удзел у падобных конкурсах — не першы вопыт маленькай спявачкі?***

**Глеб:** — Насця ўдзельнічала ў тэлевізійным фестывалі армейскай песні «Зорка», дзе стала лаўрэатам другой прэміі. Выступала на многіх конкурсах у Санкт-Пецярбургу і Маскве. Гэта, напрыклад, адкрыты конкурс выканаўцаў новай дзіцячай песні «Дзень нараджэння», дзе Насця заваявала Гран-пры — за новую песню «Сонейка дабрыні» і першую прэмію — за выкананне твора «Mamma Knows Best» з рэпертуара амерыканскай спявачкі Джэсі Джэй. Двойчы атрымлівала першыя прэміі на маскоўскім фестывалі «Залатая нота».

**Насця:** — Адным з самых складаных і запамінальным для мяне быў удзел у конкурсе «Залаты голас Расіі». Я прыехала ў Маскву, і ў дзень выступлення захварэла. «Селі» звязкі. Я вельмі хвалявалася і нават плакала. Але дыхальная гімнастыка і распеўкі мяне ўратавалі. Сканцэнтравалася, добра выступіла і... заняла першае месца.

***— Перад выступленнем у Віцебску хвалюецеся?***

**Насця:** — Так, вельмі. Таму што для мяне гэта вялікае выпрабаванне. Кожны дзень рэпетыцыі, абавязкова нешта не атрымліваецца, даводзіцца пераадольваць цяжкасці.

**Глеб:** — Удзел у гэтым конкурсе — вялікі гонар. Ён вельмі складаны. Мы ведаем, што будзе моцная ўдзельніца з Расіі, мы ўжо сустракаліся з ёй на «Залатым голасе Расіі»...

**Насця:** — Таксама моцныя ўдзельнікі з Мальты, Ізраіля...

**Глеб:** — Канешне, Насця хоча выступіць належным чынам. Таму зараз не проста хвалюемся, але адчуваем вельмі вялікую адказнасць. Мы не зацыкліваемся на думках пра прызавое месца...

**Насця:** — Але заняць яго вельмі хацелася б.

***— З якімі песнямі Насця выступіць?***

**Глеб:** — Мы прадставім дзве кампазіцыі. У дзень беларускай песні сястра выканае «Я малюю» — пра тое, як дзеці малююць свет без вайны і бедаў. Мы не хочам палітызаваць выступленне, але пытанне вайны і міру вельмі актуальнае ў сучасным свеце. А другая кампазіцыя — «I Don't Mean a Thing» з рэпертуару вядомай джазавай спявачкі Элы Фіцджэральд. Гэта старая джазавая песня, якую многа хто выконваў цягам дзесяцігоддзяў. І, на наш погляд, яна самая моцная, яе Насця досыць доўга спявае.

***— А адкуль у маленькай дзяўчынкі такое захапленне сур'ёзнай музыкай, джазам?***

**Насця:** — Я люблю слухаць Адэль, Джэсі Джэй, гурт IOWA, люблю цікавую, эфектную музыку. Гэта як класіка, джаз, так і сучасныя творы. Без музыкі ўжо нікуды.

**Глеб:** — Насця першапачаткова выхоўвалася ў сям'і на музыцы, якая нетыповая для расійскай ці беларускай эстрады. Мы яе называем «спартыўнай»: ухіл ідзе не на славянскую душэўнасць, а на тэхнічна складаныя моманты, характэрныя для Захаду. Сёння Насці больш даспадобы менавіта такія песні. Пры гэтым выдатна разумеем, што быць аднабаковым выканаўцам — не вельмі правільны шлях. Таму ў рэпертуары ёсць і беларускія кампазіцыі, напрыклад "Я люблю цябе, Белая Русь", а таксама твор пра Беларусь і Расію «Дзве суседкі, дзве сястрыцы». Каб Насця іх навучылася добра выконваць, спатрэбілася мая класічная вакальная адукацыя, бо песні таксама вельмі складаныя. Сястра развіваецца ў розных кірунках як у плане вакалу, так і музычнага мыслення. Гэта вельмі важна.

**«Сёння Насці больш даспадобы выконваць песні са складанымі тэхнічнымі кампанентамі. Пры гэтым выдатна разумеем, што быць аднабаковым выканаўцам — не вельмі правільны шлях.**

***— Не крыўдна, што цяпер усе дзеці адпачываюць, а табе даводзіцца працаваць?***

**Насця:** — Мае канікулы распачнуцца ў жніўні *(усміхаецца)*.

**Глеб:** — Мы абавязкова адпачнём, але крыху пазней. Сёння конкурс — галоўнае, раз нам выпаў такі гонар прадстаўляць краіну. Трэба апраўдаць спадзяванні і выступіць годна. Самае важнае, што Насця гэта разумее і ў свае 10 гадоў сур'ёзна ставіцца да працы.

***— Ведаю, што Насця піша вершы і пастаянна публікуецца на старонках «Зорькі»...***

**Насця:** — Спачатку бабуля дапамагала, а потым я і сама пачала пісаць, мне гэта вельмі падабаецца.

***— А песні сама пісаць яшчэ не спрабавала?***

**Глеб:** — Гэта досыць складаны працэс. Я думаю, што Насця гэта зможа зрабіць гады праз два, калі лепш авалодае фартэпіяна.

***— Якія планы на будучыню?***

**Глеб:** — Усё ў многім будзе залежаць ад выступлення на конкурсе. Ёсць задума прыняць удзел у фестывалі «Новая хваля», а ў жніўні плануем пачаць рыхтавацца да Нацыянальнага адбору на дзіцячае Еўрабачанне.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

Перамога ў чарговым конкурсе.




ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 6.07.2016 г.

# СМЕХУ ВАРТА!

## Каб адчуць, што такое беларускі народны гумар, варта паехаць у Аўцюкі

**Добрая навіна: у пятніцу 8 ліпеня на раздарожжы паміж Малымі і Вялікімі Аўцюкамі адкрыецца восьмы Усебеларускі фестываль народнага гумару. Аб тым, што там будзе і хто, «Звязда» папрасіла расказаць «бацьку-заснавальніка» фестывалю, пісьменніка Уладзіміра ЛІПСКАГА.**



***— Уладзімір Сцяпанавіч, факт, напэўна, вядомы ўсім: Аўцюкі — сталіцу айчыннага гумару — адкрылі вы. А вось як гэта адбылося?.. Давайце нагадаем.***

— Давайце, і пачнём здалёку, з таго, што некалі ў Малых Аўцюках жыла мая старэйшая сястра. Яна была замужам за ляснічым і якраз нарадзіла двойню. Мы з бацькам вырашылі глядзець. Шашы там, вядома ж, не было, нейкага транспарту — таксама. І таму з нашых Шоўкавічаў мы пайшлі пехатой. Помню, па нейкіх балотах, па кладках... Месцамі бацька мяне пераносіў...

Што яшчэ з таго часу помню — першы раз еў куплёную каўбасу і першы раз адчуваў сябе госцем... Але ж потым сястра пераехала ў Калінкавічы, і я пра гэту вандроўку, напэўна, забыўся б, бо на дзіцячы розум Аўцюкі як Аўцюкі — вёска як вёска...

***— ...Ну хіба што дзве іх — Аўцюкі Вялікія і Малыя... І Малыя, дарэчы, большыя за Вялікія?***

— Што, вядома ж, смешна... А далей болей, як той казаў, бо праз многія гады ў тых мясціны я вырашыў завітаць ужо як старшыня Беларускага Дзіцячага фонду і як пісьменнік. Дарэчы, еду туды, і кіроўца ў мяне пытаецца, ці ведаю я, што гэта за вёскі, расказвае, што аўцюкоўцы — яны, маўляў, такія: яны, калі нешта не даспадобы, то і пабіць яшчэ могуць.

***— Было ад чаго спалохацца?***

— Па шчырасці, я рады, што гэтага не зрабіў, што некалі не збочыў, што, як пісаў Генадзь Бураўкін: шмат дзе «...ездзіў і крочыў, у аб'езд і нацянкі, і шчаслівы, што аднойчы завітаў у Аўцюкі...». Бо людзі там сапраўды адметныя — вельмі шчырыя, працавітыя, вясёлыя... Такія ж, як у маіх родных Шоўкавічах. І ў той жа час — трошкі не такія. Узяць першы і, напэўна, ужо кожнаму вядомы жарт: «Манька, а ці мыешся ты? — Мыюся. — А дзе? — У рэчцы. — А зімой? — А колькі той зімы?» Гэта ж адтуль... Ці «Калінка, чаму ў вас толькі адзін сынок? Дачушку пара пашукаць... — Каласок, не падлаўлю свайго мужа цвярозым». Альбо вось яшчэ. Цешча — зяцю: «Мне так дрэнна было, так дрэнна — думала, памру». Ён ёй: «А я спадзяваўся». Альбо вось: «Ці праўда, што свая жонка лепш, чым чужая? — Так, але пераканацца ў гэтым хоча кожны»... Зноў жа пра аўцюкчу. Просіцца тая ў загадчыка фермы: «Адпусці, каласок, раней часу дамоў. — Навошта? — А я з канём дамовілася...»

***— Сапраўдная «смеханосная» жыла!***

— Так. Дык ці трэба здзіўляцца, што я, патрапіўшы на яе, пайшоў па бабках, па дзядках, па хатах і проста ўлюбіўся ў гэтых людзей! Помню, начаваў у адной бабулі... Раніцай прачынаюся, яна даўно на нагах, але ж кажа, што яшчэ не снедала. «А што ж, — пытаюся, — у вас на сняданак?» — «Патапцы», — адказвае. Колькі жыў, думаю, такой стравы не чуў... А гэта, як высвятляецца, хлеб, пакрышаны ў малако... Вось вам і патапцы.

У другой бабулі (гадоў 80-ці) вечарам быў. Яна за прасніцай сядзела: расказвала мне і паказвала, колькі падушак мае (а яны ж гарой на ложках ляжаць... І ўсе наваліі ў вышыўках!), расказвала, што замужам ніколі не была: не знайшлося, маўляў, чалавека... Я запісваю ўсё на дыктафон. А яна, бачу, вочкам на яго пакосіцца і адсунецца. Пытаюся, чаму? Адказвае: «Дык жа нейкае вочка гарыць. Баюся, каб мая кудзелька не ўспыхнула».

Карацей, я там столькі ўсяго сабраў і запісаў, што з'явілася кніжка «Пра каласкоў і калінак, якія гаруюць і жартуюць».

Але і пасля гэтага кропку паставіць не мог. Хацелася неяк уславіць гэтых людзей, нешта зрабіць для іх, хацелася, каб Аўцюкі для сябе адкрылі іншыя.

***— Атрымліваецца, якраз на гэтай «глебе» і нарадзілася ідэя фестывалю беларускага народнага гумару?***

— Так. Але ж спачатку я падзяліўся ёю з калегамі па пяры. І толькі пасля гэтага разам з Генадзем Бураўкіным і Алесем Петрашкевічам мы пайшлі да тагачаснага міністра культуры Анатоля Бутэвіча. Ён, дзякаваць Богу, і выслухаў нас, і падтрымаў, і потым прыехаў на адкрыццё... Цуд якое свята атрымалася! Пасярэдзіне, паміж Вялікімі і Малымі Аўцюкамі, у лесе пабудавалі вялікую сцэну і ўсё патрэбнае, правялі электрычнасць, назапрашалі гасцей — у тым ліку замежных...

Дарэчы, напярэдадні папрасілі месцічаў выкасіць траву. Прыехалі, так бы мовіць, «прымаць работу» і бачым не паверылі: латка скошана, латка не. Пытаемся, чаму? Кажуць: «А той травы нашы каровы не ядуць». Ну хіба ж гэта не смешна?!

***— Уладзімір Сцяпанавіч, на першым фестывалі, 20 гадоў таму, і сапраўды былі дэлегацыі з Балгарыі, з Расіі, з Украіны... Такім чынам вашы і нашы Аўцюкі па сутнасці апынуліся на міжнароднай арбіце?***

— Я ганаруся, што так атрымалася, што ў мяне хапіла пораху не толькі адкрыць іх, але і дзвацаць гадоў падтрымліваць дух фестывалю. Бо гэта — маё дзецішча.

Я рады, што на папярэднім, сёмым фестывалі, мы адкрылі ў Аўцюках музей беларускага народнага гумару, што там ёсць карчма «Ганарысты парсюк», што людзі, можна сказаць, з усяго свету ідуць і едуць туды, што там спраўляюць вяселлі... І я, дарэчы, усім кажу, што можна сядзець у інтэрнэце, нешта «стрыгчы» адтуль, нешта прыдумляць. А можна паехаць у Аўцюкі і адчуць, што такое народны гумар. Прычым ён не толькі аўцюкоўскі, ён сапраўды беларускі і сапраўды народны! Гэта ж мы вось такія — можам сказануць дык сказануць!

На вялікі жаль, сёлета на фестываль не прыедзе заўсёдны госць, легендарны дырыжор і народны артыст Міхась Дрынеўскі. Надоечы мы размаўлялі з ім, і я папрасіў, каб той расказаў нейкі жарт. Ён злёту, на трасянцы выдаў «аўцюкоўскі» дыялог: «Ты ўжо ўстроіўся? — Не, пакуль не: яшчэ работаю».

***— Шкада, вядома ж, што не будзе Міхаіла Паўлавіча... А хто будзе? І што будзе на сёлетнім фестывалі?***

— Усе карты раскрываць, вядома ж, не хацелася б — нават для любімай «Звязды». Але ў нашай краіне ёсць нямала цікавых, самабытных калектываў — у Спораве (Бярозаўскі раён), у Дубіне (Валожынскі), у Шуміліне, у Быхаве, у Капылі, на радзіме Крапівы... У Гомелі, кажуць, бабулькі-энтузіясткі знайшліся... А ўсё чаму? Таму, што гумар быў і застаецца запатрабаваным, таму што людзям падабаецца — і самім нешта сказануць, і прыпеўку скласці, і іншых паслухаць...

На фестывалі выступіць ансамбль «Свята», прыедуць Уладзімір Радзівілаў, Анатоль Зэкаў, Мікола Шабовіч, рэдакцыя часопіса «Вожык»... Сваю выставу зладзіць мастак Алег Карповіч (дарэчы, сёлета мы з ім выдалі сумесную кнігу «Над Аўцюкамі тармазні»)... І без сумнення будзе мноства адкрыццяў — новых таленавітых анекдотчыкаў, прыпевачнікаў, чытальнікаў, апавядальнікаў...

***— Фестываль пачнецца, як заўжды, на раздарожжы?***

— Так, паміж Малымі і Вялікімі Аўцюкамі, непадалёк ад карчмы «Ганарысты парсюк». Сёлета мы там адкрыем помнік Каласку ды Калінцы і Лаву прымірэння, каб усе, хто пасварыўся ці паспрачаўся — хлопец з дзяўчынай, сусед з суседам, мужык з жонкай, — маглі завітаць туды, «высвеліць адносіны» і ўрэшце памірыцца.

А назаўтра ажыве вялікая плошча ў Калінкавічах. Там жа адкрыецца і новая вуліца, на якой будуць прадстаўлены падворкі — з Вялікіх і Малых Аўцюкоў, з Сырода, з усіх 17 сельсаветаў! І гэта ўнікальна, бо там усе адметнасці, усе «фірмовыя» фішкі: і прыказкі-прымаўкі, і стравы, і народныя ўмельцы, і напоі...

***— Можа, нават «Рагатуха» будзе?***

— А як жа!.. Міліцыянер у Аўцюках застукаў дзеда за самагонная апарата. Кажа: «Кіньце гэтую справу, а то пасаджу ў турму. — А тады мой сын будзе гнаць. — Я і сына пасаджу. — То ўнук заменіць. — А калі і ўнука? — То ўсё роўна без «рагатухі» не будзем, бо к таму часу я ўжо адсяджу».

***— Вось і пагутары з імі, з тымі аўцюкоўцамі...***

— Я настойліва гэта раіў бы, прычым — кожнаму госцю. А яшчэ — не прапусціць «Алімпійскія аўцюкоўскія гульні», конкурс прыгажосці «Міс Аўцюкі»...

Паралельна з імі на галоўнай сцэне распачнецца выступленне гумарыстаў — дэлегацый з усіх абласцей і горада Мінска. Журы будзе вызначаць пераможцаў у шасці намінацыях: анекдот, жарт, прыпеўка, мініяцюра...

Напрыканцы адбудзецца заключны гала-канцэрт. Карацей, і на гэтым фестывалі павінна быць весела, мудра, прыгожа, што здольна стварыць добры настрой. А ён, у сваю чаргу, — паўплывае на здароўе і нават на лёс. Так што сардэчна запрашаю.

***— Засталося нагадаць, што трапіць на свята можна толькі праз аўцюкоўскую мытню?***

— Так. Але ж пашпартоў ды віз там ніхто спаганяць не будзе, а вось без жарту ці прыпеўкі можна і не прайсці... Хіба што на лапу мытнікам даць. Так што выбірайце, што танней. І, вядома ж, прыходзьце: я ўпэўнены — не пашкадуеце.

***— Дзякуй.***

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

# ВЫШЫВАНКІ НЕМАЎЛЯТАМ

**Цішыню калідораў у радзільным доме Дзяржынскай цэнтральнай раённай бальніцы час ад часу перарываюць звонкія галасы нованароджаных. Іх маці знаходзяцца ў пастаянным кантакце з малымі і пад кантролем медперсаналу. Днямі ў радзільню завіталі асаблівыя госці — прадстаўнікі Мінскага абласнога камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Іх сустракаў загадчык акушэрскага аддзялення Валерый Лебядзеўскі.**

Распашонка з беларускім арнаментам стала першым падарункам для нованароджанай Паліны і яе маці Таццяны. Такім арыгінальным і незвычайным спосабам актывісты павіншавалі маці і немаўлят адразу з некалькімі ўрачыстымі падзеямі.

— Акцыя «Падары нованароджанаму вышыванку» была прымеркавана да свята «Дзень вышыванкі», якое прайшло 2 ліпеня. А 3 ліпеня Дзяржынск адзначыў не толькі Дзень Незалежнасці, але і свой 870-гадовы юбілей, — канстатаваў першы сакратар Мінскага абласнога Камітэта грамадскай арганізацыі «БРСМ» Дзмітрый Варанюк.

Падарункі з нацыянальным арнаментам атрымалі двое немаўлят. Іх матулям былі ўручаны кветкі.

Спакон веку вышываная сарочка лічылася не толькі адзеннем, але і абярэгам — сімвалам шчасця, здароўя, прыгажосці і родавай памяці. І сёння ў Мінскай вобласці і ва ўсіх рэгіёнах краіны традыцыі вырабу вышыванак не страчаны. Болей за тое, яны беражліва захоўваюцца.

— Няхай гэтыя невялікія падарункі саграваюць вас цеплынёй, — сказаў Дзмітрый Варанюк. — Я рады, што мы можам падзяліцца з маладымі мамамі і іх малымі часцінкай свайго сэрца.

Дадам, дабрачынная акцыя «Падары нованароджанаму вышыванку» з поспехам прайшла ў многіх гарадах Міншчыны.

— Гэта вельмі міла і патрыятычна. Мой сынок нарадзіўся 26 чэрвеня, у Дзень моладзі, што таксама сімвалічна. Распашонку мы абавязкова будзем надзяваць на ўсе значныя святы, — падзялілася ўражаннямі Вольга. — Дзякуй за такі цудоўны падарунак.

У 2015 годзе ў Дзяржынскім радзільным доме на свет з'явіліся 825 дзяцей. Як сцвярджаюць спецыялісты, сёлета іх будзе больш.

**Ларыса КОРШУН.**

■ Філатэліст

# НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ. НА НАШЫХ МАРКАХ

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 3 ліпеня выпусціла ў абарачэнне дзве паштовыя маркі і блок з серыі «Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь». На іх — дзяржаўны сцяг нашай краіны, яе герб і словы гімна.**







З 4 ліпеня ў абарачэнні таксама паштовы блок «Сафійскі сабор у Полацку», а з 8-га — дзве паштовыя маркі з серыі «Цырк». Адметна, што абодва цыркі (Беларускі дзяржаўны ў Мінску і Гомельскі дзяржаўны) размешчаны ў цэнтры гарадоў, з'яўляюцца іх візітоўкамі і ўлюбёнымі месцамі баўлення часу — і дзяцей, і дарослых... ■







■ Святочнае

# У Бабруйску прапісаўся пажарны абоз



**Незвычайная скульптурная кампазіцыя ўпрыгожыла пляцоўку каля пажарнай часці №4 на вуліцы Кастрычніцкай. Гэта своеасаблівы напамін пра тое, якімі сродкамі перамяшчэння ў пачатку XX стагоддзя карысталіся ратаўнікі. Ручная вадзяная помпа, усталяваная на пажарнай карэце, перададзена ў часць бабруйчанінам Генадзем Сідарэнкам.**

Адкрыццё скульптурнай кампазіцыі адбылося ў рамках святкавання 629-годдзя з дня заснавання Бабруйска і 72-й гадавіны яго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пад гукі пажарнай сірэны чырвоную стужку перарэзалі старшыня Бабруйскага гарвыканкама Андрэй Каваленка, намеснік міністра МНС Беларусі, генерал-маёр унутранай службы Аляксандр Худалееў, староста Заходняга Варшаўскага раёна Ян Жымінскі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by* ■

## УП «Забудова-Автотранс» (организатор аукциона) извещает о проведении второго повторного открытого аукциона по продаже имущества

| № лота | Наименование лота | Начальная цена с НДС, бел. рублей | Задаток с НДС, бел. рублей | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль OPEL VECTRA 2003 г.в.** | **4 454,4** | **44,54** | **5** |

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Валюта торгов – белорусский рубль. Валюта платежа – белорусский рубль.

Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 25.07.2016 в 13.00**
**по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4**

Заявки на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 11.07.2016 по 22.07.2016.**

Документы, необходимые для участия в торгах – заявление на участие в аукционе; платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов (его представителя). Необходимые документы должны быть представлены по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4, **не позднее 16 часов 00 минут 22 июля 2016 г.**

Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества, выставляемого на торги.

*Задаток перечисляется на следующие реквизиты: р/с 3012164225082 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226. Получатель – УП «Забудова-Автотранс», УНП 600468334.*

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.

Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона. По вопросу ознакомления с Лотом связываться по телефону: 8 029 160 11 86 в рабочие дни с 8.00 до 17.00

**☎ Организатор: 8 (0176) 724 711**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже недвижимого имущества, принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» (Продавец):

**ЛОТ № 1** – нежилое помещение с инв. № 330/D-182, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Интернациональная, д. 109. Начальная цена с НДС – 41 400,00 (414 000 000)* бел. руб. Задаток – 2 070,00 (20 700 000)* бел. руб.

**ЛОТ № 2** – здание нежилое с инв. №710/С-10624, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, д. 54. Начальная цена с НДС – 172 080,00 (1 720 800 000)* бел. руб. Задаток – 8 604,00 (86 040 000)* бел. руб.

Земельный участок площадью 0,0997 га с кадастровым номером 741000000006000013.

**ЛОТ № 3** – доля 67/500 РУП «Жилкоммунтехника» в административном здании с инв. №700/С-4639, расположенном по адресу: г. Могилев, ул. Лазаренко, д. 29. Ограничения (обременения), устанавливаемые в отношении недвижимого имущества, в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Начальная цена с НДС – 88 560,00 (885 600 000)* бел. руб. Задаток – 4 428,00 (44 280 000)* бел. руб.

Земельный участок площадью 0,0447 га с кадастровым номером 740100000003000458. Право аренды земельного участка. Срок действия по 04.09.2021. Доля РУП «Жилкоммунтехника» – 67/500.

**ЛОТ № 4** – гостиница с инв. №714/D–11556, расположенная по адресу: Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, д. 15. Начальная цена с НДС – 105 570,00 (1 055 700 000)* бел. руб. Задаток – 5 278,50 (52 785 000)* бел. руб.

Земельный участок площадью 0,1076 га с кадастровым номером 724850100001000516 Доля РУП «Жилкоммунтехника» составляет 11/200.

**ЛОТ № 5** – комплекс из здания и строений, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4: 1. Здание склада (литер А 2/к) с инв. № 500/С–8445. 2. Здание проходной (литер Б 1/к) с инв. № 500/С-8494. 3. Здание специализированное автомобильного транспорта (литер Ж 1/к) с инв. № 500/С-36553. 4. Гараж (литер В 1/м) с инв. № 500/С–23647. 5. Гараж (литер Д 1/м) с инв. № 500/С-23648. 6. Гараж (литер Г 1/м) с инвентарным номером 500/С-23649. На капитальные строения с инв. № 500/С-8494; 500/С-36553; 500/С-23647; 500/С-23648; 500/С-23649 имеются свидетельства о регистрации. Начальная цена с НДС – 1 971 360,00 (19 713 600 000)* бел. руб. Задаток – 98 568,00 (985 680 000)* бел. руб.

Аренда. Часть здания склада (литер А 2/к) с инв. № 500/С-8445 сдается по договору аренды: – 152,5 кв.м до 22.07.2019; 16,8 кв.м до 03.05.2020; 34,3 кв.м до 14.10.2016. Гараж (литер В 1/м) с инв. № 500/С-23647 сдается по договору аренды: 74,2 кв.м до 03.05.2020.

Земельный участок площадью 0,4575 га с кадастровым номером 500000000001000440. Право временного пользования. Срок действия по 31.05.2021.

*()* – Цена указана в денежных знаках образца 2000 г.*

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__),* **проводимом 08 августа 2016 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли–продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли–продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by в сумме не более 1 200 000 (Один миллион двести тысяч) белорусских рублей.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415–З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов.

Аукцион состоится **08.08.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 04.08.2016 до 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2016. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона: 8(017) 306–00–57, 8(029) 356–90–03, 8(029) 550–09–52 • www.ino.by • e–mail: torgi@ino.by**

БАНК РЕШЕНИЕ

# Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2015 года

## ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2015 ГОДА

| *В миллионах белорусских рублей* | Примечание | 31 декабря 2015 года | 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 4 | 175 597 | 111 264 |
| Обязательные резервы, депонируемые в Национальном банке Республики Беларусь | | 5 805 | 5 855 |
| Производные финансовые инструменты | 5 | 153 468 | 129 428 |
| Кредиты и дебиторская задолженность | | 465 834 | 337 931 |
| *Средства в банках* | *6* | *7 597* | *4 883* |
| *Кредиты клиентам* | *7* | *458 237* | *333 048* |
| Финансовые активы, имеющиеся в наличии для продажи | 8 | 5 696 | 5 696 |
| Основные средства | 9 | 101 833 | 105 211 |
| Нематериальные активы | | 1 580 | 2 596 |
| Текущее налоговое требование | | 815 | 33 |
| Прочие активы | 10 | 96 551 | 67 483 |
| **Итого активы** | | **1 007 179** | **765 497** |
| **Обязательства** | | | |
| Финансовые обязательства, учитываемые по амортизированной стоимости | | 724 240 | 562 141 |
| *Средства других банков* | *11* | *521* | *28 764* |
| *Средства клиентов* | *12* | *495 503* | *352 624* |
| *Собственные выпущенные ценные бумаги* | *13* | *53 016* | *45 052* |
| *Обязательства по финансовому лизингу* | | *3 303* | *3 624* |
| *Субординированные займы* | *14* | *171 897* | *132 077* |
| Прочие обязательства | 16 | 8 856 | 6 038 |
| **Итого обязательства** | | **733 096** | **568 179** |
| **Капитал** | | | |
| Уставный капитал | 17 | 631 700 | 515 062 |
| Непокрытый убыток | | (357 617) | (317 744) |
| *Непокрытый убыток на начало года* | | *(317 744)* | *(294 752)* |
| *Совокупный убыток за отчетный период* | | *(39 873)* | *(22 992)* |
| **Итого капитал** | | **274 083** | **197 318** |
| **Итого обязательства капитал** | | **1 007 179** | **765 497** |

## ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2015 ГОДА

| *В миллионах белорусских рублей* | Примечания | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы | 18 | 88 052 | 88 830 |
| Процентные расходы | 18 | (61 973) | (44 809) |
| **Чистые процентные доходы** | | **26 079** | **44 021** |
| Комиссионные доходы | 19 | 33 179 | 22 248 |
| Комиссионные расходы | 19 | (4 200) | (4 845) |
| **Чистые комиссионные доходы** | | **28 979** | **17 403** |
| Чистый доход (расход) по операциям с производными финансовыми инструментами и иностранной валютой | 20 | 28 138 | (4 583) |
| Чистые доходы по операциям с финансовыми активами, имеющимися в наличии для продажи | | - | 7 |
| Чистое начисление/(восстановление) прочих резервов | | (1 779) | 1 260 |
| *Чистое начисление/(восстановление) резервов по обязательствам кредитного характера* | *16* | *(1 779)* | *(24)* |
| *Чистое начисление/(восстановление) резервов прочим активам* | | - | *1 284* |
| Прочие доходы | 21 | 8 199 | 51 362 |
| **Итого операционные доходы** | | **89 616** | **109 470** |
| Расходы на персонал | | (42 050) | (46 145) |
| Амортизация | | (5 476) | (5 962) |
| Административные расходы | 22 | (34 491) | (46 692) |
| Чистый убыток от обесценения прочих активов | 10 | (10 218) | (17 271) |
| Чистое начисление резерва под обесценение кредитов клиентам | 7 | (36 024) | (5 991) |
| **Убыток до налогообложения и отражения убытка по чистой монетарной позиции** | | **(38 643)** | **(12 591)** |
| Расходы по налогам на прибыль | 15 | (1 230) | (490) |
| **Убыток до налогообложения и отражения убытка по чистой монетарной позиции** | | **(39 873)** | **(13 081)** |
| Убыток по чистой монетарной позиции | | - | (9 911) |
| **Чистый убыток за отчетный год** | | **(39 873)** | **(22 992)** |
| **ИТОГО СОВОКУПНЫЙ УБЫТОК ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД** | | **(39 873)** | **(22 992)** |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2015 ГОДА (ПРЯМОЙ МЕТОД)

| *В миллионах белорусских рублей* | Примечания | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|
| *Движение денежных средств от операционной деятельности* | | | |
| Проценты полученные | | 76 090 | 88 163 |
| Проценты уплаченные | | (60 030) | (44 610) |
| Комиссии полученные | | 32 129 | 21 469 |
| Комиссии уплаченные | | (4 133) | (4 823) |
| Реализованный результат по операциям с финансовыми активами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прибыль или убыток | | 73 519 | - |
| Реализованный результат по операциям с иностранной валютой и драгоценными металлами | | 12 226 | (541) |
| Прочие операционные доходы | | 8 199 | 25 853 |
| Расходы на персонал уплаченные | | (42 050) | (46 145) |
| Уплаченные административные расходы | | (34 491) | (46 185) |
| **Движение денежных средств, (использованных в)/полученных от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах** | | **61 459** | **(6 819)** |
| *(Увеличение) уменьшение операционных активов* | | | |
| Обязательные резервы на счетах в Национальном банке Республики Беларусь | | 50 | 554 |
| Средства в других банках | | 1 870 | 1 697 |
| Кредиты клиентам | | (60 215) | (20 358) |
| Прочие активы | | (2 206) | 29 285 |
| *Увеличение (уменьшение) операционных обязательств:* | | | |
| Средства других банков | | (29 833) | (10 069) |
| Средства клиентов | | (5 145) | (80 027) |
| Прочие обязательства | | (1 637) | 1 265 |
| **Чистое движение денежных средств от операционной деятельности до налогообложения** | | **(35 657)** | **(84 472)** |
| **Уплаченный налог на прибыль** | | **(2 012)** | **(534)** |
| **Чистое движение денежных средств от операционной деятельности** | | **(37 669)** | **(85 006)** |
| *Движение денежных средств от инвестиционной деятельности* | | | |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | | (1 208) | (912) |
| Доходы от реализации основных средств | | - | 8 206 |
| Инвестиции в финансовые активы, имеющиеся в наличии для продажи | | - | (2 467) |
| **Чистое движение денежных средств от инвестиционной деятельности** | | **(1 208)** | **(4 827)** |
| *Движение денежных средств от финансовой деятельности* | | | |
| Эмиссия акций | | 116 638 | 41 592 |
| Поступления от выпуска собственных ценных бумаг | | 47 479 | - |
| (Погашение) собственных ценных бумаг | | (61 413) | - |
| Выплаты по обязательствам финансового лизинга | | (365) | (138) |
